Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

СЬНЕЖАНЬ 19 1932 г. № 282 (4534)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Павысіць баяздольнасьць вясковай ячэйкі. Ю. ЛЕНСКІ — Кампартыя Польшчы на пераломе (2-3 стар.).

АГЛЯД ДРУКУ: А збожжа — ні аднаго кілё (3 стар.).

КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ: ГАЛКІН — Вывады напрошваюцца самі сабою (1 стар.).

Рэчыцкая і рагачоўская партарганізацыі не забясьпечылі баявога кіраўніцтва збожжазагатоўкамі (1 стар.).

Мясазагатоўкам—баявыя тэмпы! (1 ст.).

Не па-кампанейску, а штодзенна выхоўваць маладых камуністаў (2 стар.).

Рыхтуйце цёплую і сытную зімоўку жывёле (3 стар.).

ЛІСТЫ РАБСЕЛЬКОРАЎ (3 стар.).

Бурныя дэманстрацыі рабочых і беспрацоўных у Германіі (1 стар.).

Паход буржуазіі супроць францускай кампартыі (1 стар.).

У змроках сутарэньняў Варшавы (4 ст.).

Германская прэса аб аднаўленьні савецка-кітайскіх адносін (4 стар.).

65.000 таварных вагонаў бяз руху (4 стар.).

Павысіць баяздольнасьць вясковай ячэйкі

Вырашаючы грандыёзныя задачы сацыялістычнага будаўніцтва, наша партыя прайшла багацейшы шлях барацьбы, шлях непрымірымага змаганьня за генэральную лінію, супроць апартуністаў розных масьцей і адценьняў. Набыт багаты вопыт будаўніцтва; выраслі новыя кадры, колькасна значна павялічылася і ідэйна-палітычна загартавалася партыйная арганізацыя.

Разам з агульным ростам гаспадаркі нашай краіны ускладніліся задачы, пашырыўся маштаб і ўзрос аб'ём усёй партыйнай работы, асабліва масавай работы сярод шырокіх пластоў рабочых, калгасьнікаў і працоўных адмасобнікаў.

Па-бальшавіцку кіруючы масамі, мабілізуючы іх на выкананьне баявых гаспадарча-палітычных задач, партыя перабудоўвае формы і мэтады сваёй работы ў адпаведнасьці з новай абстаноўкай, новымі задачамі.

Зараз, на парозе другой пяцігодкі—пяцігод пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, асабліва патрабуецца ПАВЫШЭНЬНЕ партыйнай работы, у прыватнасьці масава-выхаваўчай.

«Мы павінны здолець перабудаваць сваю работу і ячэек, у першую чаргу, такім чынам, каб аказацца на вышыні стаячых перад нам задач — кіраўніцтва масамі і арганізацыі іх вакол лёзунгаў партыі, на барацьбу за іх ажыцьцяўленьне» (КАГАНОВІЧ).

У перабудове работы, ва ўсёй дзейнасьці кожная ячэйка, кожны камуніст павінны выходзіць з таго, што КЛЯСАВАЯ БАРАЦЬБА Ў КРАІНЕ НЕ ЗАКОНЧАНА, КУЛАК РАЗГРОМЛЕН, АЛЕ НЕДАБІТ. Чым хутчэй мы ідзем да канчатковага зьнішчэньня капіталістычных элемэнтаў, тым з большай ярасьцю яны супраціўляюцца сацыялістычнаму наступленьню. На прыкладзе разгортваньня заготавак сельска-гаспадарчай прадукцыі вельмі выразна пацьвярджаецца правільнасьць указаньня XVII партканфэрэнцыі аб няўхільнасьці абвастрэньня клясавай барацьбы ў асобных парыядах на паасобных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Таму нямаюча прасяканьне ў асобных зьвеньні партыйных радоў клясава-варожых настрояў і ідэй. У дзейнасьці асобных ячэек і нават раёнаў прыходзіцца сустракацца ня толькі з правапартыйнай практыкай, з «лявацкімі» загібамі, але і з простым змыканьнем асобных людзей, у кішэні якіх ляжаць партбілеты, з кулацкімі элемэнтамі, з падсобніцтвам у іх антыкалгаснай, антысавецкай дзейнасьці. Аб гэтым напамінаюць ТАЛАЧЫНСКАЯ, РЭЧЫЦКАЯ, АСЬБЕЙСКІЯ справы, аб гэтым-жа гаворыць справа ЖЫРАКОВА, б. сакратара Жлобінскага райкому КП(б)Б і рад фактаў кулацкай антызагатоўчай дзейнасьці асобных «камуністаў», аб якіх паведамляла «Зьвязда».

Сьнежаньскі пленум ЦК КП(б)Б паставіў «у якасьці аднэй з цэнтральных задач партарганізацый — перабудову арганізацыйнай партыйна-масавай работы, якая забясьпечыла-б вядучую ролю кожнай нізавой партарганізацыі ў гаспадарча-палітычным жыцьці вёскі, ідэйнае ўзбраеньне кожнага камуніста на непрымірымую барацьбу з малейшымі праяўленьнямі апартунізму і ўплыву кулацтва на канкрэтных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва». Гэтымі днямі апублікавана пастанова ЦК УсеКП(б) аб чыстцы партыі. Чыстка партыі, перабудова работы нашых арганізацый — гэтыя два важнейшыя палітычныя мерапрыемствы ідуць у адным кірунку—У КІРУНКУ ПАВЫШЭНЬНЯ КЛЯСАВАЙ БАЯЗДОЛЬНАСЬЦІ, БАЛЬШАВІЦКАЙ ЗАГАРТАВАНАСЬЦІ КОЖНАЙ АДЗІНКІ НАШАЙ ПАРТЫІ.

Удасканаленьне арганізацыйнай структуры вясковай арганізацыі, правільная расстаноўка камуністычных сіл, разьвіцьцё бальшавіцкай работы ў масах, ачышчэньне партыйных радоў ад апартуністаў, кулацкіх дапаможнікаў — актывізуюць жыцьцё вясковай ячэйкі, павысяць яе ролю як кіраўніка разгорнутага сацыялістычнага наступленьня.

ЦК КП(б)Б праверыў, як ідзе перабудова ў Спуцкім, Мазырскім і Лёзьнянскім раёнах. Пленум ЦК, заслухаўшы даклады гэтых райкомаў, падкрэсьліў, што яны «НЕ ПАДНЯЛІ НА ПАТРОБНУЮ ВЫШЫНЮ РОЛЮ ВЯСКОВАЙ ЯЧЭЙКІ, ЯК КІРАЎНІКА ПАРТЫЙНА-ПАЛІТЫЧНАГА І ГАСПАДАРЧАГА ЖЫЦЬЦЯ СЯЛА І АРГАНІЗАТАРА ШТОДЗЕННАЙ БАРАЦЬБЫ З ФАКТАМІ ПРАЯЎЛЕНЬНЯЎ ЗАМЯШАНАСЬЦІ ПЕРАД ТРУДНАСЬЦЯМІ І ХВАСЬЦІЗМУ З БОКУ АСОБНЫХ КАМУНІСТАЎ».

«Зьвязда» давопі шырока асьвятліла партыйна-масавую работу ў Спуцкім і Лёзьнянскім раёнах. Матар'ялы пераконваюць, што парткіраўніцтва гэтых раёнаў не займалася як след вывучэньнем структуры вясковай арганізацыі, невыстарчальна ведае ўмовы і асаблівасьці кожнай ячэйкі, не аддавала патрэбнай увагі расстаноўцы камуністычных сіл.

Мазырскі райком не сканцэнтраваў сваёй увагі на галоўных вучастках работы і яўна недаацаніў вядучай галіны сваёй сельскай гас падарки—жывёлагадоўлі. Ва ўсіх трох раёнах арганізацыйная перабудова праводзілася або фармальна, або зусім выпала з кругавіду кіраўніцтва.

Дрэнна пастаўлена ўнутрыпартыйнае выхаваньне, не наладжана пастаянная работа з беспартыйным актывам. Бяссыстэмнасьць, камандзішчына, рыўкі характарызуюць становішча агітацыйна-масавай работы ня толькі ў паказаных арганізацыях.

Слуцкая і Лёзьнянская арганізацыі, як і ўся КП(б)Б, дабіліся раду посьпехаў у арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, у правядзеньні чарговых гаспадарча-палітычных кампаній. Але з посьпехам ісьці наперад мы зможам толькі тады, калі перабудуемся, калі формы, мэтады, размах партыйнай работы прывядзем у поўную адпаведнасьць з задачамі сёнешняга і заўтрашняга дня.

Выточным пунктам дзейнасьці вясковай арганізацыі павінна быць барацьба за плян дзяржаўных заготавак, за ўраджайнасьць, за бальшавіцкую падрыхтоўку да веснавой сяўбы. ГЭТА—СТРЫЖНЯВЫЯ ПЫТАНЬНІ АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАГА УМАЦАВАНЬНЯ КАЛГАСАЎ.

Галоўнае ў вырашэньні гэтых задач — стварыць моцны актыў з перадавых калгасьнікаў і працоўных адмасобнікаў. «Апіраючыся ў сваёй штодзённай рабоце на моцны калгасны актыў, парт'ячэйкі забясьпечваюць сацыялістычнае перавыхаваньне калгасьніка ў працэсе барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў» (сьнежаньскі пленум ЦК КП(б)Б).

Трэба зламаць тую коснасьць, недаацэнку арганізацыйных пытаньняў, якая назіраецца яшчэ ў радзе раёнаў. «Арганізацыйнае пытаньне, таварышы, вырашае справу... Ленін, Сталін нас вучылі, што не павінна быць такога бальшавіцкага палітыка, які не павінен займацца арганізацыйнымі пытаньнямі» (КАГАНОВІЧ).

Ва ўмовах вясковай арганізацыі гэта бальшавіцкая работа павінна заключацца ў стварэньні сапраўды апорных ячэек, ва ўзмацненьні кіруючых кадраў, удасканаленьні структуры (ліквідацыя міжсельсавецкіх, арганізацыя самастойных ячэек у калгасах, саўгасах і г. д.), расстаноўцы сіл у брыгадах, перакідцы камуністаў з менш важных адміністрацыйных работ непасрэдна на вытворчасьць і інш. Трэба забясьпечыць ПАСТАЯННАЕ КІРАЎНІЦТВА і дапамогу партыйнаму арганізатару і групавому агітатару.

Адна з важнейшых задач вясковай ячэйкі — нападзіць па-сапраўднаму ўнутрыпартыйнае выхаваньне. Праз партыйны дзень, палітшколу, у працэсе разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі і ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, у працэсе сацыялістычнага будаўніцтва і клясавай барацьбы мы павінны загартоўваць вясковыя кадры, выкоўваць з маладых камуністаў стойкіх бальшавікоў.

Сьнежаньскі пленум ЦК КП(б)Б паставіў задачу перад райкомамі «дабіцца канкрэтнага і дыфэрэнцыяванага кіраўніцтва кожнай парт'ячэйкай на аснове вывучэньня гаспадарчых і палітычных асаблівасьцяй кожнай вёскі, саўгасу, МТС, калгасу».

Пастанова сьнежаньскага пленуму па дакладу трох райкомаў зьяўляецца ЎЗОРАМ ТАКОГА КАНКРЭТНАГА КІРАЎНІЦТВА. Задача райкомаў праз інструктарска-прапагандысцкую групу, праз узмацненьне кіруючых кадраў вясковай ячэйкі глыбока вывучаць яе работу, папярэджваць промахі, памылкі, выпраўляць іх на-ходу, а не займацца ячэйкай толькі тады, калі выляцілася якая-небудзь гучная справа.

Сьнежаньскі пленум ЦК КП(б)Б апрача партмасавай работы разгледзеў пытаньне барацьбы за ўраджайнасьць, аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, аб заготаўках і школе. Усе гэтыя пытаньні зьвязаны паміж сабою самым цесным чынам.

Перабудова партыйнай работы, разгортваньне агітацыі, разьвіцьцё бальшавіцкай масавасьці — важнейшая ўмова посьпяховай барацьбы за ўраджайнасьць, за агратэхніку, за выкананьне плянаў заготавак збожжа, мяса і інш.

Штодзенна выхоўваючы маладыя кадры, выганяючы з радоў нашай партыі апартуністаў, здраднікаў, кулацкіх агентаў з партбілетамі, ячэйка больш узьнімем баяздольнасьць вясковай арганізацыі, забясьпечым новыя посьпехі ў баёх за сацыялізм.

Рэчыцкая і рагачоўская партарганізацыі не забясьпечылі баявога кіраўніцтва збожжазагатоўкамі

Перамогшы кулацкае супраціўленьне, поўнасьцю ліквідаваць запазычанасьць дзяржаве па збожжы

Вывады напрошваюцца самі сабою...

(АД НАШАГА СПЭЦЫЯЛЬНАГА КАРЭСПАНДЭНТА)

Увесну г. г. старшыня Збароўскага сельсавету **Дзядкоў** і сакратар парт'ячэйкі **Панічкоў** пафарсілі, пахваліліся лічбамі. У прыгожых і гучных тапах яны рапартавалі Рагачоўскаму раённаму кіраўніцтву аб скапчэньні веснавой сяўбы, аб поўным выкананьні пляну. У Рагачове ім паверылі на слова, ніхто не пацікавіўся праверыць, наколькі рапарт гэты адпавядае сапраўднасьці. Збароўскі сельсавет быў залічан у сьпіс поўнасьцю завяршыўшых сяўбу.

Між тым, гэта было яўным ашуканствам партыі, ашуканствам замаскаваным дутымі лічбамі. На справе сельсавет у мінулую пасеўкампанію недасеў звыш 200 га зямлі. Замест 1.200 га, вызначаных заданьнем, было засеяна толькі 971 га. Замест 303 га, было пакінута пад папар 532 га.

А зараз сельсавет крычыць аб адсутнасьці збожжа, аб немагчымасьці выканаць заданьне па загатоўках у сувязі... з недасевам. Трэба проста сказаць, што гэта—чарговае ашуканьне партыі, новая чарговая авантура.

Пачнем з калгаснага сэктару. У сельсавеце 2 калгасы—«**Найвэг**» і «**Рэвалюцыя**». Першы ідзе ўперадзе па правядзеньні ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній, другі—сыстэматычна зрывае заданьне па загатоўках. «Найвэг» значна перавыканаў плян алгрэзкі бульбы, «Рэвалюцыя» не дадала 21,6 цэнтн. «Найвэг» поўнасьцю выканаў плян збожжазагатовак, «Рэвалюцыя»—з 25 кастрычніка зусім спыніла здачу збожжа, выканаўшы заданьне на 46 проц.

Сакратар сельсавету **Кірэйшын** паўтарае даўно завучаны сьпеў:

— Ведаеце, у калгасе няма збожжа. Быў недарод. Заданьне нерэальнае...

Але дарэмна... Спроба знайсьці «аб'ектыўную прычыну», разьбіваецца ўпчэнт аналізам лічбаў яго-ж сельсавецкай зводкі. З гэтай зводкі ясна відаць, што валавы збор ураджаю збожжавых культур у калгасе «Рэвалюцыя» быў у тры разы больш, чым у калгасе «Найвэг», заданьне-ж на загатоўках у апошняга не на многа менш, чым у першага. Чаму-ж адзін выканаў поўнасьцю плян загатовак, а для другога ён аказаўся нерэальным? Прычына, зразумела, не ў «адсутнасьці збожжа». Прычына **ў нежаданьні здаваць яго дзяржаве.** Прычына ў тым, што на чале калгасу стаіць заможнік **Беднікаў**, які сам агітуе супроць загатовак, сам усімі сіламі імкнецца сарваць здачу збожжа.

Беднікаву дапамагаюць такія-ж, як ён кулацкія агенты, **Купрэяў** Леванцей, **Клеранкоў** Дзяніс, пралезшыя ў калгас з мэтай перашкаджаць яго росту, яго арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню.

Ня дзіва, што калгас цягнецца ў хвасьце па ўсіх гаспадарча-палітычных кампаніях. Праўленьне калгасу неабходна аздаравіць. Трэба ачысьціць калгас ад кулацкай агентуры, ад клясава-варожых элемэнтаў. Тады ён стане, побач з калгасам «Найвэг», у рады перадавых калгасаў Рагачоўшчыны. Тады ён выканае свае абавязкі перад пралетарскай дзяржавай.

***

А аднаасобны сэктар? Тут яшчэ большае адставаньне. На 10 лістапада плян збожжазагатовак па аднаасобным сэктары выкапан на 45 проц. Запытайцеся ў старшыні сельсавету, у сакратара, чым тлумачыцца адставаньне аднаасобнікаў і яны, зрабіўшы кіслую мону, адкажуць:

—Няма збожжа, няма чаго здаваць.

Пад носам сельсавету збожжа вывозіцца на рынак, прадаецца перакупшчыкам і спэкулянтам, а сельсавет крычыць, што збожжа няма. Сельсавет добра ведае, што сераднік **Белавусаў** Мікола вывез на даж 31 кгр. аўса, але яго гэта ня турбуе. Сельсавет ведае, што заможнік **Бабораў** павінен здаць 30 пудоў збожжа, а здаў толькі 14 пудоў, што заможнік **Хадасоўскі Валяр'ян**, замест 15 пудоў здаў толькі 9 пудоў, але што да гэтага сельсавету?—ён «упэўнен», што збожжа ў заможнікаў няма. Хаця ў адносінах да заможніка Хадасоўскага сельсавет прыняў «рашучыя меры». Ён аштрафаваў яго ў разьмеры 75 руб., якія заможнік унёс, зразумела, не гаворачы ні слова, абы не здаваць дзяржаве збожжа. Ці дзіўна, што пры такім, з дазволу сказаць, «націску», кулацка-заможныя элемэнты ня выконваюць цьвёрдых заданьняў, сабатуюць збожжазагатоўкі?

Гэта ім тым больш удаецца, што старшыня і сакратар сельсавету трымаюць цесную сувязь з заможнікамі, п'янствуюць разам з імі.

У сельсавеце ёсьць партыйная ячэйка (3 чалав.), але яна працуе слаба, правільней зусім не працуе. Сакратар ячэйкі **Панічкоў** быў нядаўна зьнят з работы і выключан з партыі, як кулацкі агент, як зрыўшчык заготавак. Новы сакратар ячэйкі не ўзяўся за арганізацыю работы ячэйкі, за расстаноўку сіл на загатоўчым фронце.

Як вядзецца масава-палітычная работа сярод бядняцка-серадняцкіх мас Збароўскага сельсавету? Выразным адказам на гэта можа служыць заява сакратара камсамольскай ячэйкі **Кірэйшына Ягора.**

— Які ўдзел прымае камсамольская ячэйка ў збожжазагатоўках?

— Мы хадзілі разам з членамі сельсавету на хатах і **загадвалі** здаваць збожжа...

Іншымі словамі ячэйка ЛКСМБ разам з членамі сельсавету займалася голым адміністраваньнем у адносінах да беднякоў і сераднякоў і, замест правядзеньня масавай работы, проста загадвала здаваць збожжа. Зразумела, што гэты «лявацкі» мэтад загатовак мог прывесьці толькі да зрыву.

Злосныя зрыўшчыкі кантрактацыйных дагавароў, аднаасобнікі, якія ўпарта не жадаюць выканаць самаабавязацельствы, ня прыцягваюцца да адказнасьці. Сельсавет не папулярызуе і не скрыстоўвае закон ураду аб аднаразовым падатку для ўзмацненьня тэмпаў загатовак.

— Няма ў нас злосных зрыўшчыкаў дагавароў, — кажа сакратар сельсавету Кірэйшын.

Між тым, далёка шукаць ня трэба. Такіх зрыўшчыкаў лёгка знайсьці нават і сярод членаў сельсавету. Вось Піскуноў Антон, Назараў Ян, Купрэеў Хведар, Клімовіч Ян, Клімовічы Лявон і інш. Усе яны лічацца ак тывістамі, усе прымацаваны да паасобных вучасткаў і ўсе... самі ня выканалі абавязацельстваў перад дзяржавай. Якія-ж меры прымае сельсавет да сваіх-жа членаў, якія ня выконваюць абавязацельстваў па загатоўках?—**Ніякіх.** Ні адзін ня выключан са складу сельсавету, ні адзін не аддадзены пад суд. Чаго-ж дзівіцца, што вучасткі, дзе працуюць гэтыя члены сельсавету, сыстэматычна цягнуцца ў хвасьце кампаній?

***

Кіраўніцтва Збароўскага сельсавету паказала сябе нядбальным змагацца за выкананьне дырэктыў партыі і ўраду, за баявое правядзеньне гаспадарча-палітычных кампаній. Падпаўшы пад уплыў клясава-варожых элемэнтаў, займаючыся больш п'янкамі, чым практычнай работай, кіраўніцтва сельсавету сыстэматычна зрывае заданьні па ўсіх відах загатовак.

Вывад напрошваецца сам сабою. І гэты вывад павінны зрабіць неадкладна рагачоўскія рённыя арганізацыі.

С. Галкін.

Вёска Збароў, Рагачоўскага раёну.

Тэмпы збожжазагатовак па БССР

(у процантах да гадавога пляну)

Здана на 10 сьнежня

Калгасы МТС	Інш. калгасы	Аднаасобнікі	Усяго здана	Разам з насеннапазыкай
103,4	76,3	59,9	66,7	60,2

Здана на 15 сьнежня

Калгасы МТС	Інш. калгасы	Аднаасобнікі	Усяго здана	Разам з насеннапазыкай
105,4	78,1	62,7	68,9	62,6

Пералом яшчэ невыстарчальны

РЭЧЫЦА. (Наш кар.). Чацьверты дзень штурму даў некаторы зрух у ходзе збожжазагатовак па раёну. Ёсьць значнае нарастань не тэмпаў. Калі 11 сьнежня паступіла на загатпункты ўсяго 38 цэнтн. збожжа, дык 14-га здана 114 цэнтн.

Аднак на 15 сьнежня плян па раёну выкананн на 52 проц. Прырост за пяціднёўку складае ўсяго 3 проц.

Гэта гаворыць за тое, што ўзятыя тэмпы невыстарчальныя. Аднаасобны сэктар усё яшчэ адстае. Кулацкі сабатаж не атрымаў рашучага адпору. Возьмем напрыклад Горвальскі сельсавет, які зьяўляецца самым адстаючым у раёне. На 15 сьнежня плян па аднаасобным сэктары выкананн на 31,9 проц.

Гэты сельсавет мае ўсе ўмовы для датэрміновага выкананьня пляну збожжазагатовак. Ураджай па сельсавету ў гэтым годзе добры. Плян здачы ў параўнаньні з мінулым годам зьменшан амаль на 50 проц.

Сельсавет налічвае вялікі актыў: партыйцаў—21 чал. камсамольцаў 35,—настаўнікаў—11 і 21 член сельсавету. І ўсё-ж, ня гледзячы на гэтыя выключна спрыяючыя ўмовы, збожжазагатоўкі ідуць злачынна марудна. Кантрактанты ня выконваюць сваіх дагавароў, калгасы не зварочваюць насеннапазыкі, з кулацка-заможных гаспадарак ня спаганяюцца цьвёрдыя заданьні.

Прычыны такога ганебнага адставаньня крыюцца ў якасьці кіраўніцтва.

Партыйная ячэйка да гэтага часу не ўзначаліла гэту важнейшую гаспадарча-палітычную кампанію. Партыйцы расстаўлены не ву частках фармальна. Ячэйка не правярае работу брыгадзіраў і таму, некаторыя з іх, як ЛАПІКА, ЮРКОЎ, ДВОРКІН АРОН, ЦЫРУЛЬНІКАЎ і інш. проста «навісаюць» ву частках, а практычна нічога не робяць.

Большая-ж частка членаў партыі і кандыдатаў зусім не праводзіла ніякай работы па збожжазагатоўках і нават не выяжджала на свае вучасткі (ХАЙТОВІЧ, УВАРАЎ, РОХЛІН, БАБІЦКІ Н.).

Ні адзін член сельсавету ня выканаў яшчэ свайго заданьня. Члены сельсавету: КАНОДА ЯЗЭП, ГАЛЫШ Я. зусім адмаўляюцца выконваць кантрактацыйныя абавязацельствы.

Як лепшы мэтад барацьбы за збожжа тут выбралі складаньне судовых прыгавораў. 13 сьнежня кіраўнікі сельсавету папрыхтавалі поўную папку афармленых актаў для выяжджаючага судзьдзі. Сюды папалі і некаторыя бядняцкія гаспадаркі, якія плацяць па 7 р. с.-г. падатку. (Дзюбка Аляксандр).

Зусім інакш працуе брыгада, якая выехала ў Артукоўскі куст.

У в. Веленъ, Хоцімірскага сельсавету брыгада разгарнула шырокую распумачальную работу сярод калгасьнікаў і працоўных адмасобнікаў аб значэньні датэрміновага выкананьня пляну збожжазагатовак. У выніку гэтага на працягу дня большасьць сялян гэтай вёскі ліквідавала запазычанасьць, адправіўшы абозам звыш 2 тон збожжа.

Веленцы ўзялі на прамадаку буксір вёсны Калочын і выслалі туды сваю брыгаду. На працягу 3-х гадзін на заготпункт у в. Калочын паступіла звыш 5 цэнтн. збожжа.

Паселішчы ЛЕЦЕШЫН і ДУХАНАЎКА, Вышамірскага сельсавету ўжо поўнасьцю выканалі свае заданьні.

Ва ўсіх вучастках Артукоўскага і Вышамірскага сельсавету выязная брыгада выпускае насьценгазэты. Лепшым здатчыкам выдаюцца ўдарныя кніжкі, па якіх яны атрымаюць з каапэрацыі ў першую чаргу ўсе тавары.

Д.

Мясазагатоўкам—баявыя тэмпы!

Застаўся адзін тыдзень

Сьнежаньскі пленум ЦК КП(б)Б з усёй бальшавіцкай рашучасьцю падкрэсьліў нездавальняючае становішча мясазагатовак БССР, адсутнасьць кіраўніцтва гэтай справай з боку раду раённых арганізацый, прыпаў нездавальняючай работу загатоўчага апарату.

Апошнія даныя аб ходзе мясазагатовак сьведчаць аб тым, што дырэктывы партыі не знайшлі яшчэ патрэбнага праламленьня ў загатоўчай рабоце на мясоцох. Ёсьць поўная пагроза зрыву выкананьня пляну чацьвертага кварталу.

Паводле даных, на 15 сьнежня па БССР плян 4-га кварталу выканан на 63,5 проц.

Рад раёнаў — Чачэрскі, Цераханскі, Уваравіцкі, Клічаўскі, Кармянскі, Жлобінскі загатовілі менш 40 проц. Лічбы паказваюць, што ў гэтых раёнах няма барацьбы з кулацкім супраціўленьнем загатоўкам, з кулацкай агентурай у нізавых зьвеньнях загатоўчага апарату.

Дрэнна загатаўляюць мяса Полацкі, Чырвонапольскі, Рэчыцкі, Асьвейскі, Крупскі і інш. раёны.

Той факт, што саўгасны сэктар загатовіў толькі 53 проц. квартальнага пляну, гаворыць аб адсутнасьці барацьбы паасобных раённых камітэтаў партыі і ячэек з буржуазнымі, месьніцкімі тэндэнцыямі ў паасобных саўгасах.

Яшчэ горш стаіць справа з загатоўкамі па аднаасобным сэктары, які здаў толькі 39 проц. З кулацкіх гаспадарак нічога не спагнана.

Засталося каля тыдню да тэрміну, вызначанага партыяй для выкананьня пляну 4-га кварталу. За гэты час трэба правесьці наступныя мерапрыемствы:

— Праверыць выкананьне абавязацельстваў кулацка - заможнымі гаспадаркамі, ужыўшы самыя суровыя меры ўзьдзейнасьці.

— На аснове масавай работы сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў дабіцца поўнага выкананьня пляну. Штрафаваць злосных зрыўшчыкаў мясазагатовак, арганізаваўшы ў кожным сельсавеце праверачныя брыгады.

— Праверыць выкананьне заданьняў саўгасамі, рашуча змагаючыся з разбазараньнем мясной прадукцыі.

— Выгнаць кулацкіх агентаў з калгасаў і СТКФ.

Посьпех загатовак залежыць ад баяздольнасьці загатоўчага апарату на мясоцох. Ён павінен быць узмоцнен вытрыманымі працаздольнымі работнікамі.

25 сьнежня апошні тэрмін. Да гэтага часу павінна быць здана ня менш 15 тысяч тон мяса.

Бурныя дэманстрацыі рабочых і беспрацоўных у Германіі

БЭРЛІН, 17. Наперакор абвешчанаму ўрадам «грамадзянскаму каляднаму міру», у разгар буйнейшых цэнтраў адбыліся **дэманстрацыі рабочых і беспрацоўных. У Бэрліне** адбылася дэманстрацыя ў рабочым раёне Вэдынгу. Калі падышла паліцыя і хацела арыштаваць некаторых чалавек, рабочыя рапуча сталі на абарону сваіх таварышоў. Паліцыя адкрыла страляніну па дэманстрантах.

На Ліндэнштрасэ каля 300 беспрацоўных дэманстравалі перад памяшканьнем, дзе зьбіраюцца гітлераўскія штурмавікі. Атрад гітлераўцаў, які знаходзіўся ў гэтым памяшканьні, добразьвотна прапускаў свае паслугі паліцыі для выступленьня супроць дэманстрантаў. Шмат дэманстрантаў арыштавана.

Шматлюдная дэманстрацыя рабочых і беспрацоўных адбылася таксама **ў Гале.** Рабочыя і беспрацоўныя накіраваліся ў вугальныя склады «Альвін» і патрабавалі бясплатнай выдачы вугалю, які ўжо гадамі ляжыць без скарыстаньня на гэтых складах. Дэманстранты зьявіліся з ручнымі цялежкамі, мяшкамі і кошыкамі для вугалю і рашуча заявілі, што яны ад сваіх патрабаваньняў не адмовяцца. Напалоханая адміністрацыя павінна была ўступіць і дэманстранты, пакоўтаўшы свае мяшкі і кошыкі вугалем, шчыльнымі радамі з пралетарскімі песьнямі пайшлі назад у горад.

У Кельне адбылася вялікая дэманстрацыя рабочых, у рэзультаце якой здарылася сутычка паміж дэманстрантамі і паліцыяй. Як паведамляе буржуазны друк, рабочыя нібы парапілі некалькі паліцэйскіх. Шмат рабочых арыштавана. **У Гамбургу** ў часе дэманстрацыі партызанкоў і маракоў паліцыя застрэліла матроса.

Паход буржуазіі супроць францускай кампартыі

Судовая справа супроць Рабоча-Сялянскага банку

ПАРЫЖ, 16. У Парыскім судзе пачалася слуханьнем справа Рабоча-Сялянскага банку, распачатая яшчэ пры ўрадзе Тард'е. Прыцягваючы да адказнасьці Рабоча-Сялянскі банк, французкая буржуазія хацела нанесьці ўдар усяму рабочаму руху ва Францыі і ў прыватнасьці газэце «Юманіте». Выступаўшыя па судзе экспэрты павінны былі прызнаць поўную закампамернасьць апэрацый Рабоча-Сялянскага банку і бездакорную сумленнасьць яго дырэктара Жоржа Марана. На судзе выступалі генэральны сакратар ЦК французкай кампартыі Торэз, старшыня ўчэтарнай канфэдэрацыі працы Рамамон, прадстаўнік уладчыкаў банку Жанэ. Марсэль Кашэн у лісьце суду піша, што спроба супроць Рабоча-Сялянскага банку зьяўляецца часткаю зновы буржуазіі супроць кампартыі. Прыгавор суда будзе вынесен праз тыдзень.

Пагроза зьніжэньня зарплаты 100.000 бэрлінскіх рабочых

БЭРЛІН, 17. 100 тысячам бэрлінскіх рабочых і служачых пагражае ў бліжэйшы час новае зьніжэньне зарплаты. Уласьнікі раду буйнейшых прадпрыемстваў будаўнічай прамысловасьці абвясьцілі, што яны ня маюць намеру паўтоўжыць тарыфнага дагавору, які канчаецца ў сьнежні. Уласьнікі будаўнічых прадпрыемстваў, а таксама ўласьнікі рэстаранаў ужо скасавалі дагаворы. Таксама скасаваны дагаворы з пекарамі, краўцамі і рабочымі каўбасных і кансэрвозных фабрык. Дырэкцыя кампаніі бэрлінскага гарадзкога транспарту абвясьціла, што яна памерана ўвесьці 40-гадзінны рабочы тыдзень, што азначала-б **скарачэньне зарплаты на 13-20 адсак.** Апрача таго, дырэкцыя памерана скасаваць тарыфны дагавор, які быў падоўжан у свой час пад націскам забастоўкі транспартнікаў. (ТАСС).

Тры перадавыя сельсаветы

ПАРЫЧЫ. ШЧАДРЫНСКІ сельсавет зьяўляецца адным з перадавых у раёне па выкананьні ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній.

На 10 сьнежня сельсавет выканаў плян збожжазагатовак на 102,2 проц. Партячэйка і сельсавет мабілізавалі ўвесь мясцовы актыў на датэрміновае выкананьне пляну.

9 членаў сельсавету—прэміяваныя ўдарнікі—штодзенна змагаліся за выкананьне ўсіх відаў загатовак.

У адстаючыя вёскі былі накіраваны лепшыя сілы, наладжана некалькі масавых чырвоных абозаў, у якія былі ўцягнуты сотні калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў.

У выніку рашучага націску на кулацка-заможныя гаспадаркі цьвёрдыя заданьні па сельсавету поўнасьцю спагнаны.

Следам за Шчадрынскім сельсаветам скончылі збожжазагатоўкі ПАРЫЦКІ і СЬЦЯПАНСКІ сельсаветы.

За ўзорныя тэмпы барацьбы за збожжа пленум РВК пастанавіў прэміяваць гэтыя тры сельсаветы.

Л. І.

Спэкуляцыя збожжам з санкцыі райкалгассаюзу

КАПЫЛЬ. Паасобныя работнікі райкалгассаюзу, замест мабілізацыі калгасных мас на датэрміновае выкананьне пляну збожжазагатовак, замест растлумачэньня пастаноў ЦК і СНК СССР аб загатоўках і гандлі збожжам, займаюцца самі скупкай жыта па калгасах для ўласных патрэб, патураючы гэтым спэкуляцыі збожжам.

Старшыня райкалгассаюзу Эльпэр купіў у калгасе «Ільліч» 3 пуды жыта. Бухгальтар райкалгассаюзу Кантаровіч набыў у калгасе «Чырвоная ніва» 2 пуды жыта і «хадайнічае» перад праўленьнем аб продажы яму яшчэ 5 пудоў.

Ня дзіўна, што калгасьнікі разглядаюць такія дзеяньні адказных работнікаў калгассыстэмы, як санкцыю па спэкуляцыю збожжам.

(БЕЛТА).

Раскрадвальнікі збожжа пакараны

ДРЫСА. Выязная сэсія Вярхоўнага суда разгледзела справу аб пакражы збожжа ў ТАЗ'е (таварыства па апрацоўцы зямлі) «Пераможнік», Вялынецкага сельсавету. (Матар'ялы аб гэтай справе друкаваліся ў «Зьвязьдзе»). Сэсія прытаварыла раскрадвальніка калгаснага збожжа **Ахрэма Бароху** да пазбаўленьня волі на дзесяць год з паражэньнем у правох на тры гады і канфіскацыяй часткі маемасьці.

ПЕРАДАВІКІ

Наступныя раёны ідуць уперадзе па выкананьні пляну мясазагатовак чацьвертага кварталу:

1. Жыткавіцкі р. загатовіў	142,3 проц.	5. Менскі	— 100,2 проц.
2. Тураўскі	— 138,8 проц.	6. Бярэзінскі	— 96,3 проц.
3. Ч.-Слабодзкі	— 115,9 проц.	7. Брагінскі	— 95,9 проц.
4. Мсьціслаўскі	— 102,0 проц.	8. Заслаўскі	— 91,9 проц.

Чорная дошка

Наступныя раёны зрываюць выкананьне пляну мясазагатовак чацьвертага кварталу:

1. Кармянскі — 31,8 проц.; 2. Чачэрскі — 33 проц.; 3) Жлобінскі — 35 проц.; 4) Уваравіцкі — 35,2 проц.; 5) Гомельскі — 35,5 проц.; 6) Дубровенскі — 38,1 проц.; 7) Клічаўскі — 38,5 проц.; 8) Церахаўскі — 38,6 проц.; 9) Асіповіцкі — 39,5 проц.

За разбазараньне таварнай прадукцыі і безгаспадарчасьць—пад суд

МАСКВА. Пастановаю Наркамсаўгасу зьняты з работы і прыцягнуты да судовай адказнасьці дырэктары аршанскіх сьвіна саўгасаў «Каменка» тав. Кудзінковіч, «Прагрэс» тав. Сокалаў і «Пабеда» тав. Пашкевіч, якія дапусьцілі разбазараньне таварнай прадукцыі і безгаспадарчае вядзень не справы. (ТАСС).

Мсьціслаўшчына перавыканала плян чацьвертага кварталу

МСЬЦІСЛАЎЛЬ.

Партыйнае будаўніцтва

Не па-кампанейску, а штодзенна выхоўваць маладых камуністаў

Рабоце з кандыдатамі—пастаянную ўвагу

Нядаўна пры Менскім гаркоме КП(б)Б адбылася нарада сакратароў парткалектываў, на якой падводзіліся папярэдніе рэзультаты правядзеньня дня кандыдата. Нарада заслухала інфармацыі парткалектываў заводаў «Бальшавік», імя Мясьнікова, фабрык «Акцябр», абутковай, друкарні імя Сталіна і Менбуду.

Гэтыя інфармацыі і спрэчкі, якія шырока разгарнуліся на нарадзе, паказалі, што дзень кандыдата на большасьці менскіх прадпрыемстваў быў праведзен здавальняюча. Аб гэтым гавораць і факты падачы заяў у партыю калектываў. Так, у дзень кандыдата ў парткалектыў заводу «Бальшавік» чатыры лепшых рабочых падалі заявы аб уступленьні ў партыю, па заводзе імя Мясьнікова — 5 і інш.

Добра падрыхтавалі і правялі дзень кандыдата па заводзе «Бальшавік». Там работу з кандыдатамі дыфэрэнцыявалі, правёўшы занятні асобна з групай кандыдатаў, якія за некалькі месяцаў не ўплацілі членскіх узносаў, з групай, якая ня мае партыйнай нагрузкі і інш.

Дзень кандыдата паказаў, што рад партыйных калектываў з кандыдатамі займаюцца час ад часу. Аб гэтым выразна гаворыць патрыклад, заява тав. Цёмкіна (друкарня імя Сталіна), што яны «знайшлі» кандыдата партыі Сіневіча з 1925 году. Цілова — 1930 г. і інш. 4-х чалавек з вялікім кандыдацкім стажам. Тав. Цёмкін на нарадзе проста заявіў: «Мы ня ведалі, што ў нас ёсьць такія кандыдаты».

Кандыдаты партыі Менбуду, калі з імі праводзілі гутаркі, заявілі: «З намі працавалі толькі тады, калі мы былі беспартыйныя, а калі мы ўступілі ў партыю, пра нас забылі». Кандыдаты партыі на заводзе «Бальшавік» скарджаліся, што ім не даюць магчымасьці наведваць партвучобу з-за розных пяўвязак.

Толькі цэхер, калі праведзена праверка работы з кандыдатамі, калі праведзены з імі індывідуальныя групавыя гутаркі, на радзе прадпрыемстваў, якія неахапільвалі работу з кандыдатамі, зроблен пералом.

Праведзеная работа дала відавочна добрыя вынікі. Вось некаторыя прыклады.

Пасьля кандыдацкага дня тав. Шмуйловіч (ф-ка «Кастрычнік») напісала заяву, што яна зрабіла вялікую памылку, зацягнуўшы вяўплату членскіх узносаў за 9 месяцаў, і адразу заплаціла ўсё. Гэта-ж зрабілі кандыдаты партыі тав. Торма, Гершановіч (абутковая) — першы ўнёс членскія ўзносы за 9 месяцаў, другі за чатыры. У большасьці выпадкаў пасьля правядзеньня гутарак кандыдаты ўносілі членскія ўзносы.

Усе недахопы работы з кандыдатамі, ускрытыя пры правядзеньні кандыдацкага дня, павінны быць неадкладна зжыты. Трэба раз на заўсёды пакончыць з кампанейшчынай.

Кандыдацкі стаж поўнасьцю павінен быць выкарыстан для бальшавіцкага загартаваньня маладога камуніста. Гэта патрабаваньне павінна быць выканана ў штодзённай рабоце партыйных арганізацый з кандыдатамі.

М. Р—віч.

Так трэба працаваць

Да дня кандыдата на заводзе «Ударнік» была праведзена вялікая падрыхтоўчая работа. Бюро партыйнага калектыву намецілі цэлы рад практычных мерапрыемстваў, як лепш правесьці дзень, як наладзіць работу з кандыдатамі. Адным з гэтых мерапрыемстваў было стварэньне дзьвёх брыгад для ўцягненьня ўсіх кандыдатаў партыі ў работу, для праверкі ўплаты членскіх узносаў, ушчэпленьня кандыдатаў у партвучобу і інш.

Апрача гэтага, перад кандыдатамі дзён групарторгі і парторгі правялі гутаркі ў партыйных групах, на якіх прысутнічалі ўсе рабочыя брыгад, аб значэньні гэтага дня і неабходнасьці правядзеньня глыбокай выхаваўчай работы сярод кандыдатаў. Тутжа растлумачвалася, якія пытаньні будуць разглядацца ў дзень кандыдата, каб кожны кандыдат і рабочы рыхтаваліся па іх.

Вось чаму вечарам 5-га сьнежня ўсе кандыдаты (а іх на заводзе 29) і маладыя члены партыі, а таксама значная частка беспартыйных рабочых зьяліся ў свой клюб, каб атрымаць указаньні, як працаваць, як вучыцца, як загартоўвацца, каб быць этой кім бальшавіком.

***

5 гадзін вечара. З усіх цэхаў, брыгад зьхоўваюцца кандыдаты партыі. Насыпех п'юць гарбату з пячэньнем і чакаюць заняткаў. Тут-жа завязваюцца спрэчкі на розных пытаньнях. Кандыдат партыі т. Тарайкэвіч кажа, што Роза Люксэмбург была прадстаўніком левага крыла сацыял-дэмакратыі, тав. Ратнэр даказвае, што гэта ня зусім так, што хоць яна і была ў левым крыле, але ўсё-ж такі часамі хісталася. Спрэчкі ідуць і па іншых палітычных пытаньнях.

Усіх кандыдатаў партыі разьбілі на дзьве групы. Са старымі кандыдатамі займаецца сакратар парткалектыву тав. Гінзбург, а з кандыдатамі сталінскага заклику займаецца сакратар цэхавай парт'ячэйкі тав. Ратнэр. Адна група прапрацоўвае пытаньне аб першай пяцігодцы і ўступленьні ў другую, у другой групе правяжыцца гутарка аб статуце і праграме партыі.

Асабліва жыва прайшла гутарка з кандыдатамі сталінскага заклику. Тав. Ратнэр добра падрыхтаваўся і талкова, зразумела, растлумачвае галоўнае ў статуце і праграме партыі. Кандыдаты сталінскага заклику ўважліва слухаюць гутарку, сыплюць пытаньні:

— Як прымаюцца ў партыю выключаныя з яе?

— На якіх прынцыпах будуюцца статуты ў замежных камуністычных партыях?

— Які статут камуністычнага Інтэрнацыяналу? І інш.

Тав. Ратнэр дае кароткія, але зразумелыя адказы.

Ня кожна прайшла заняткі і ў другой групе. Гутарка прайшла даволі жыва. Кандыдаты таксама задалі шмат пытаньняў.

— Якая будзе роля дзяржавы ў канцы другой пяцігодкі?

— Як будзе ісьці працэс зьнішчэньня classaў насуп? і інш.

Выступаючым кандыдаты партыі вынесьлі практычныя прапановы аб зьнішчэньні раду непаладкаў на заводзе, каб па-ўдарнаму скончыць першую і ўступіць у другую пяцігодку. Тут-жа выносіцца прапанова пра весьці шырокую работу па замацаваньні рабочых да канца другой пяцігодкі.

***

Парткалектыў заводу «Ударнік» правяжыць сыстэматычную работу з кандыдатамі, асабліва з кандыдатамі сталінскага заклику. У сыстэме работы вялікую ролю адыгрываюць дні кандыдата. Гэты кандыдацкі дзень на заводзе ўжо чацьверты. Кандыдаты на 100 проц. і актыўна наведваюць свае дні. Праз іх добра ўсвялі, што яны павінны быць перадавікамі на вытворчасьці. Усе яны зараз маюць нагрузкі і актыўна ня выконваюць іх. Да больш слабых кандыдатаў прыкрэплены члены партыі, якія да кажнага дапамагаюць ім выконваць заданьні парт'ячэек і правяжыць з імі гутаркі на розныя тэмы ўнутранай і міжнароднай палітыкі.

Парткалектывам другіх прадпрыемстваў трэба браць прыклад работы з кандыдатамі на заводзе «Ударнік».

М. Сакалоўскі.

Павышаць якасьць ідэйна-выхаваўчай работы

Гомельская партыйная арганізацыя за апошнія гады значна ўзрасла. У рады КП(б)Б прышлі лепшыя прадстаўнікі рабочай клясы і калгаснага сялянства. Толькі за 1932 год у партыю прынята 8.000 чалавек.

Разам з гэтым расьце і павышаецца адказнасьць партыйных калектываў і ячэек у справе палепшэньня якасьці ідэйна-выхаваўчай работы ў марксыцка-ленінскім духу.

Ня гледзячы на вялікі ўрух пастановкі выхаваўчай работы з кандыдатамі, усё-ж на сёньняшні дзень гэты вучастак партработы ў Гомелі і Гомельскім рабоне значна адстае ад запатрабаваньняў.

Некаторыя партыйныя калектывы і ячэйкі работу з кандыдатамі праводзяць ад выпадку да выпадку. На фабрыцы «Вэзэўі» зусім ігнаруюць работу з кандыдатамі. Толькі 40 проц. усяго кандыдацкага складу ахоплена партвучобай, астатнія 60 проц. па-за школамі партыйнай асьветы. На заводзе «Пралетары» ахоплена вучобай 35 проц. кандыдацкага складу. На вёсцы партвучоба зусім не расначата.

Няма сур'ёзнага падыходу і да разьмеркаваньня партнагрузак. Ня маюць нагрузак: на фабрыцы «Вэзэўі» — 10 асоб, на мясакамбінаце — 50 проц. усяго кандыдацкага складу. І гэта ў той час, калі 25 проц. кандыдатаў перагружаны партнагрузкамі. На заводзе «Пралетары» кандыдат партыі тав. Вазводка атрымаў пяць нагрузак. У выніку ён ні з адной не спраўляўся. Партыйная ячэйка замест разгрузкі і практычнай дапамогі дала яму вымову за невыкананьне нагрузак.

Зусім нездавальняючая пастаноўка выхаваўчай работы ў мінулым затармазіла перавод кандыдатаў у члены партыі. Кандыдатаў з пратэрмінаваным кандыдацкім стажам па гомельскай арганізацыі налічваецца каля 30 проц.

Аб дрэнным рабоце з кандыдатамі гавораць самі кандыдаты. Вось словы кандыдата партыі з заводу імя Ланцуцкага тав. Белянова: «ніякай работы сярод кандыдатаў парткалектыў не праводзіць. Кандыдатаў не прымаюцца да членаў партыі, не праводзяць з імі гутарак і г. д. Я сам хадзіў кандыдатам 9-ты месяц. Час пераводзіцца ў члены, але я лічу сябе не падрыхтаваным».

Далей такое становішча непэрпіма.

Гомельскі гарком КП(б)Б можа і павінен добра наладзіць работу па выхаваньні новага папаўненьня радоў КП(б)Б.

Ф. Папярэцкі.

Пытаньне ўсплыло нечакана...

Работа з кандыдатамі партыі амаль ні на адным з віцебскіх прадпрыемстваў ня ўзьнята на належную вышыню. Гэта з усёй выразнасьцю пацьвердзіў дзень кандыдата, які адбыўся 5 сьнежня.

На шчацінна-шпоцачным камбінаце пытаньне аб кандыдацкім дні ўсплыло нечакана. Аб ім упершыню загаварылі на бюро парткалектыву толькі 3-га сьнежня. Невыпадкова, што і вынікі атрымаліся дрэнныя: з 51 кандыдата на сходзе прысутнічала толькі 25, а з усёй партарганізацыі, якая налічвае звыш 180 партыйцаў, прысутнічала 80 чал. і 25 беспартыйных. Ня лепш стаіць справа і з якасьцю. Ні адзін кандыдат, ні адзін беспартыйны ня выступілі па дакладу аб рабоце з кандыдатамі. Адсутнасьць многіх членаў і кандыдатаў партыі, пасьўнасьць—невыпадковыя. Гэта вынік недапушчальна слабай работы парткалектыву і цэхавых парт'ячэек з новым папаўненьнем.

За ўвесь час існаваньня камбінату бюро парткалектыву і цэхавыя парт'ячэйкі ні разу не выцікавіліся тым, як кандыдаты партыі выконваюць свае нагрузкі, ці ахоплены яны палітвучобай, якое наведваньне школ і г. д.

Палітвучобай ахоплена фармальна 28 кандыдатаў, а вучацца адзінкі. Сакратары парт'ячэек шчацінага і паборнага цэхаў Шагіра і Крабэ ў дні вучобы склікаюць сходы, чым зрываюць заняткі. Нагрузкі паміж кандыдатамі размеркаваны няроўнамерна. Шмат хто па горла перагружан, а некаторыя ня маюць зусім нагрузкі. Цікава адзначыць, што партарганізацыя камбінату ня ведае колькасьці кандыдатаў, ахопленых сацпаборніцтвам і ўдарніцтвам.

Зусім дрэнна падрыхтавалася да кандыдацкага дня партарганізацыя фабрыкі плутай мяблі. На сход зьявілася 50 проц. кандыдатаў, беспартыйных усяго 2 чал. Па дакладу ні адзін з прысутных ня выступіў. Палітвучобай на фабрыцы ахоплен... 1 кандыдат.

Таксама неадрыхтавана, як і шчацінны камбінат, правяла кандыдацкі дзень буйнейшая партарганізацыя Віцебску—фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі». З 238 членаў і кандыдатаў партыі, зьявілася на сход 160 і з 4-тысячнага калектыву фабрыкі—26 беспартыйных. Камсамолец ня прышоў ні адзін. У спрэчках выступілі тры кандыдаты. Выступаўшыя ніячэ раз пацьвердзілі, што дырэктывы партыі аб рабоце з кандыдатамі не ажыцьцяўляюцца.

Большасьць кандыдатаў не ахоплены ні партнагрузкамі, ні палітвучобай. Запазычанасьць па членскіх узносах вялізарная—ад 6 да паўтары гадоў (тав. Тафт і інш.).

Добра падрыхтавала і правяла кандыдацкі дзень ячэйка друкарні «Камінтэрн». У перыяд падрыхтоўкі з кожным кандыдатам і маладым членам партыі праводзіліся індывідуальныя гутаркі. Сам сход прашоў вельмі актыўна. З 28 партыйцаў выказалася 14 чалавек. Аб чым гаварылі выступаўшыя таварышы?

— 38 год, як я працую ў друкарні,—кажа машыніст кандыдат партыі тав. Зысьлін.—Яшчэ ўлетку мяне прынялі кандыдатам, але да гэтага часу з праграмай і статутам як след не знаёмілі. Палітзаняткі ў нас не праводзяцца. Яшчэ ня было такога выпадку, каб хто-небудзь зацікавіўся, як я выконваю сваю нагрузку старшыні каап бюро. Як і раней, так і зараз, я ніякіх тэм рытычных ведаў не набываю.

— Са мной справа такая-ж,—сьпяўме стары наборшчык тав. Гінзбург.—Мяне ніхто ня ўцягвае ў актыўную партработу. Партнагрузкі я ня маю.

Тав. Замалін, Гілінсон і Найкін зусім шчыра скарджацца на тое, што з імі не праводзяць ніякай палітвыхаваўчай работы, не дапамагаюць у выкананьні партнагрузак, не рэкамэндуюць чытаць якія-небудзь кніжкі.

Аналёгічнае становішча работы з кандыдатамі і маладымі членамі партыі і на іншых віцебскіх прадпрыемствах (гарбарня, «Чырвоны мэталіст», фабрыка КІМ і інш.).

Камэнтары і вывады да гэтага непатрэбны. Слова за віцебскім гаркомам КП(б)Б.

Раіса Южнова,
Рыг. Вярхоўскі.
Арн. Зарубежны.

Правільна арганізаваць работу тэхніка-экспэрымэнтальных баз

ЦК УсеКП(б) у пастанове ад 26 кастрычніка 1930 г. даў выразную дырэктыву ўсім наркаматам, аб'яднаньням і заводакіраўніцтвам аб арганізацыі тэхніка-экспэрымэнтальных баз. У выкананьне дырэктывы партыі Усесаюзны СНГБ вынесьлі пастановы аб арганізацыі ў Беларусі цэнтральнага экспэрымэнтальнага заводу, чарцёжна-канструктарскага бюро і экспэрымэнтальных брыгад на прадпрыемствах. Адмак гэтыя пастановы фактычна засталіся на паперы. Брыгады ёсьць на вельмі нязначнай частцы прадпрыемстваў.

Адсутнасьць моцных тэхніка-экспэрымэнтальных баз у сыстэме прамысловасьці Беларусі тлумачыцца тым, што аддзелы рацыяналізацыі ўпаўнаркамцяжпраму і НКЛПВ, замест ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі займаюцца разгаворамі аб цяжкасьцях і немагчымасьці іх выканаць. Справу арганізацыі чарцёжна-канструктарскага бюро НКЛПВ «вырашыў» узяцьцем да сябе на працу аднаго чарцёжніка. З прычыны адсутнасьці тэхнічнай кансультацыі для выходнядаў і рацыяналізатараў застаюцца невырашанымі шмат тэхнічных і арганізацыйных пытаньняў, што затрымлівае прапрацоўку і падачу рабочых прапаноў у «БРИЗ'ы». Адсутнасьць-жа чарцёжна-канструктарскіх бюро не дае магчымасьці «БРИЗ'ам» своечасова выразна выносіць тэхнічныя заключэньні, асабліва па складаных вынаходствах і ўдасканаленьнях.

Гэта прыводзіць да таго, што рабочыя прапановы ў выглядзе голых заяў, або нішчасьменных малюнкаў, гадамі перасылаюцца з аднае арганізацыі ў другую, абрастаючы кучай бюракратычных паперак. Так, некалькі год перасылалася прапанова тав. Граменкова — варштат для вырабу цэглы — і прапанова Дарафэева — прывод да трыкатажных машын. З тае-ж прычыны «БРИЗ'ы» і спэцыяльныя камісіі часта выносяць канчатковыя пастановы па прапановах без дэтальнага выяўленьня іх сутнасьці. Напрыклад, па прапанове інжынэра Штуцэра, аб вырабе машыны для ачосу ільну — ня раз выносіліся пастановы пабудаваць ле, але не будавалі й будаваць няма ніякіх падстаў, бо ніхто не дае адказнага заключэньня аб мэтазгоднасьці прапановы.

Існуючыя на паасобных прадпрыемствах (завод «Камунар», фабрыка «Кастрычнік», Менская абутковая і інш.) экспэрымэнтальныя брыгады, паасобныя канструктары і лябаранты не спраўляюцца з ускладзенымі на іх задачамі. Асноўны недахоп работы канструктараў заключаецца ў тым, што яны не поўнасьцю выкарыстоўваюць самых аўтараў, рабочыя калектывы і спэцыялістаў, і без дэтальнай прапрацоўкі прапаноў робяцца рабочыя чарцяжы. На фабрыцы «Кастрычнік» па прапанове рабочага Міронава зрабіць варштат для расьціў матар'ялаў, канструктар Сайноўскі адарваўшыся ад калектыву і самаго аўтара чарціў паўтары тады рабочыя чарцяжы, якія потым аказаліся нягодным, бо канструкцыя была распрацавана няправільна. Такіх фактаў можна пры весьці шмат.

Недахопы работы мэханічных цэхаў на абслугоўваньні «БРИЗ'аў» заключаецца ў тым, што ўсю работу робіць адзін майстар, які ня можа быць універсалам. Ён затрымлівае месяцамі выкананьне заказаў «БРИЗ'аў», у той час, як брыгада магла-б яго выканаць у некалькі дзён. Мэханічныя цэхі часта загатаўляюць дэталі і маделі па вынаходствах і ўдасканаленьнях дэтальна непрапрацаваных. У выніку нерацыянальная затрата рабочага часу, матар'ялаў і энэргіі. Напрыклад, пабудаваная швэйабъяднаньнем насыпільная машына без дэтальнай прапрацоўкі канструкцыі, сабе не апраўдвае. Пабудаваны фабрыкай «1 мая» варштат для адпячатаньня скурак ня можа быць уведзен у эксплёатацыю, бо яго канструкцыя няправільная. Некаторыя прыдумшчыкі БРИЗ'у такія мэтады працы называюць рызыкай, не разумеючы таго, што такая «рызыка» прыносіць дзяржаве сотні тысяч рублёў страты. Яны мярыпуюць рацыяналізатарскія прапановы, перашкаджаюць прамысловасьці павялічваць фонды сацыялістычнага накапленьня. Значна тармозіць справу рэалізацыі рабочых прапаноў і тое, што мэханічныя цэхі дробных прадпрыемстваў ня могуць выконваць заказ цалкам і яго прыходзіцца раздаваць частямі ў пэхі іншых прадпрыемстваў (аднаму каваць, другому точыць і сьвідраваць, трэцяму страгаць).

Тэхніка-экспэрымэнтальныя базы патрэбны кожнай фабрыцы, заводу і прамысловай арцелі. Ад правільнай арганізацыі іх работы ў значнай меры залежаць тэмпы рацыяналізацыі вытворчасьці. Вось чаму накідаць задаваньні ад тэхніка-экспэрымэнтальных баз прадпрыемстваў, на якіх непасрэдна яны ня могуць быць арганізаваны, ні ў якім разе нельга. А такіх прадпрыемстваў па Наркамлёгпраму налічваецца 70-80 проц., па лясной прамысловасьці — 80-90 проц., прамысловасьці Наркамснабу — 75-95 проц.

З усяго сказанага ясна, што ў Беларусі, апрача добраўпарадкаваных экспэрымэнтальных брыгад, на буйных прадпрыемствах павінна быць арганізавана апорная сетка тэхніка-экспэрымэнтальных баз пры буйных мэталязаводах, якія ў плянавым парадку павінны абслугоўваць «БРИЗ'ы» фабрык, заводаў і арцеляй, да іх прымацаваных.

Задачы папярэдняй тэхнічнай кансультацыі — даць поўнае і дэтальнае тлумачэньне на ўсе запытаньні рабочых, спэцыялістаў і брыгад. Папярэдняя тэхнічная кансультацыя дасьць магчымасьць рацыяналізатарам і вынаходцам, асабліва з рабочых, хутк. і канчаткова прапрацоўваць і падаваць у «БРИЗ'ы» свае рацыяналізатарскія прапановы. Кансультацыя зьвяжа адным з магутнейшых вагароў узбраеньня лепшых ударнікаў вытворчасьці тэхнічнымі ведамі.

Задача чарцёжна-канструктарскіх бюро — пасьля папярэдняга заключэньня «БРИЗ'аў» аб мэтазгоднасьці прапаноў, дэтальна выявіць і тэхнічна пісьменна аформіць усю не сутнасьць. Мабілізаваць усю сваю энэргію, веды і вопыт, а таксама энэргію, веды і вопыт рабочых і спэцыялістаў на дэтальную прапрацоўку кожнай прапановы. У сваёй рабоце чарцёжна-канструктарскае бюро павінна максымальна выкарыстоўваць саміх аўтараў. Пасьля канчатковага заключэньня «БРИЗ'аў» аб прыгоднасьці прапановы, канструктарскае бюро павінна рабіць рабочыя чарцяжы.

Асноўная праца экспэрымэнтальных майстэрань — загатоўка дэталяй і маделяй па рабочых чарцяжох, канчаткова зацьверджаных. Па больш простых вынаходках і ўдасканаленьнях рабіць дэталі і маделі без перадач у чарцёжна-канструктарскае бюро, бо такая перадача будзе толькі затрымліваць рэалізацыю рабочых прапаноў.

Бюро тэхнічнай кансультацыі, чарцёжна-канструктарскае бюро і экспэрымэнтальныя майстэрні працуюць разам, складаючы адну тэхніка-экспэрымэнтальную базу аднаведнага раёну.

Творчая энэргія рабочых і спэцыялістаў накіравана на ажыцьцяўленьне сацыялістычнай рацыяналізацыі вытворчасьці. Буйныя вынаходкі рабочых і спэцыялістаў яркі сьведчаць аб гэтым: машына для ачосу ільну інжынэра Штуцэра, машына для падборкі сфальцаваных лістоў — вынаходка рабочага друкарні імя Сталіна, шматголкавыя швэйныя машыны — вынаходства рабочага Рахленкі, аўтамат для рэзкі роліваў ланцугу Галя — вынаходка мэханіка Панкратава і г. д.

Апорныя тэхніка-экспэрымэнтальныя базы не заўсёды справяцца з прапрацоўкай і рэалізацыяй такіх вынаходстваў. Вось чаму неабходна цэнтральная экспэрымэнтальная база. У плян першага году другой пяцігодкі павінна быць уключана пабудова цэнтральнага экспэрымэнтальнага заводу БОСР. Да арганізацыі цэнтральнага чарцёжна-канструктарскага бюро і бюро тэхнічнай кансультацыі неабходна прыступіць зараз-жа, для гэтага ёсьць усе неабходнае. Часовую цэнтральную экспэрымэнтальную майстэрню трэба арганізаваць на чыгуна-лицейным заводзе трэцяй арцелі інвалідаў. Завод неабходна ўключыць у сыстэму прамысловасьці, папоўніць неабходным абсталяваньнем і кадрамі. На працягу 1-2 год, да пабудовы новага памяшканьня, пры правільнай арганізацыі работы апорнай сеткі, завод зможа цалкам абслужываць «БРИЗ'ы».

Асмалоўскі.

Інстытут мэханізацыі сельскай гаспадаркі ў Менску

Ю. Ленскі

Кампартыя Польшчы на пераломе

У пераломны момант разьвіцьця рэвалюцыйнага ўздыму адбыўся нядаўна VI зьезд кампартыі Польшчы. Вуалавая яго задача заключалася ў тым, каб на аснове правільнай ацэнкі сытуацыі намеціць рэвалюцыйную перспэктыву і згодна пастановам XII пленуму ВККІ рушыць наперад справу падрыхтоўкі партыі і пралетарыяту Польшчы да рашаючых баёў за ўладу.

«Цяперашняя абстаноўка,—гаворыць тэзісы, прынятыя XII пленумам ВККІ,—чрэвата раптоўнымі выбухамі і крутымі паваротамі падзей». Гэтыя словы вызначаюць цяперашнее становішча кампартыі Польшчы, якая стаіць перад магчымасьцю раптоўных абвалаў фашысцкай дыктатуры.

На тамных абвастрэньня эканамічнага крызісу Польшча шабліла рэкорд у параўнаньні з іншымі капіталістычнымі краінамі. Многія галіны польскага гаспадарчага жыцьця набліжаюцца да сапраўднага развалу.

Рэзкае скарачэньне прамысловай вытворчасьці пераходзіць ужо ў паралюш асобных галін прамысловасьці. Беспрацоўе і поўабеспрацоўе ахапілі значную большасьць фабрычнага пралетарыяту, кінутага на волю буржуазнай філянтропіі.

Аграрны крызіс, які цягне за сабой крайнюю дэградацыю сельскай гаспадаркі, выклікаў небывалае зьбядненьне мільёнаў сялян, штурхаемых да паўпрыгоньніцкіх умоў існаваньня.

Паскараецца фінансавае банкрутства краіны. З кожным месяцам узрастае дзяржаўны дэфіцыт, ствараючы непасрэдную пагрозу інфляцыі.

Зімой эканамічны крызіс з падвойнай сілай ударыць па зьбяднелых масах пралетарыяту, сялянства і гарадзкой дробнай буржуазіі. Буржуазны друк б'е трывогу, чакаючы буйных падзей. «Роспат мас можа прывесьці да катастрафічных вынікаў».—крычаць буржуазныя пісакі. «Польшча падае на нахільнай роўніцы»,—крычаць сацыял-фашысты, рыхтуючыся адыграць ролю апошняга рэзэрву буржуазіі.

Пакт «адмаўленьня кольцо» нераста сымулаваць казённы антымізм. Так, напрыклад, старшыня гандлёва-прамысловай палаты Кляярэр вымушан быў у пачатку сьнежня заявіць адкрыта:

«Балі два месяцы назад мы гаварылі з антымізмам, то сёньня мы [illegible] падставы для антымізму зьніклі. Нікому невядома, наколькі доўгі шлях аддзяляе нас ад «дна крызісу»...

Яшчэ больш сумна глядзяць на рэчы бліжэйшы папялечнік Пілсудзкага—палкоўнік Славэк.

«Прыпоў цяжкі перыяд,—гаварыў ён 3 сьнежня на зьезьдзе лічэнзіяраў.—Жыцьцё б'е палкай па галовах. Усюды чутны стогны. Рукі апускаюцца»...

Нават на вярхох кіруючай фашысцкай партыі чутны галасы, што «краіна перажывае ня толькі эканамічны, але і палітычны крызіс».

За прайшоўшыя два гады пасьля V зьезду кампартыі Польшчы рэвалюцыйны рух узьняўся на больш высокі ўзровень. Забастовачная хваля, база якой перасунулася з дробнай і сярэдняй у буйную прамысловасьць, ахапіла асноўныя масы рабочай клясы. Агульная колькасьць баставаўшых у 1932 г. перавалила за мільён пры 400 тыс. рабочых, занятых у прамысловасьці.

Адзюр рабочых мас наступленьню буржуазіі месцамі прымае формы контр-наступленьня супроць фашысцкай дыктатуры і капіталізму. Ад разрозьненых стачак пралетарыят перайшоў да забастовак у цэлых галінах і рабках прамысловасьці, якія суправаджаюцца масавымі сутычкамі на вуліцах, захватам паасобных фабрык і бурнымі выступленьнямі беспрацоўных.

Такі-ж шлях разьвіцьця робіць сялянскі рух. Перамагаючы ранейшую распылёнасьць, сялянскія выступленьні пачынаюць ахапляць групы вёсак, выяўляючы пры ўсіх элементах стыхійнасьці, парэчаючы вялікую арганізаванасьць. Побач з масавай барацьбой супроць падаткаў, дарожных павіннасьцяй і рычачных збораў, пачынаючыя крывавыя сэкстаткі сялян з паліцыяй з-за самачыннага высяжаньня лясоў.

VI зьезд мог адзначыць стабільнае пралетарскай барацьбы з насьпяваючымі элементамі агарнай рэвалюцыі, як адну з найбольш характэрных рыс разьвіцьця рэвалюцыйнага ўздыму ў Польшчы. На Заходняй Украіне і ў Зах. Беларусі рэвалюцыйныя выбухі сярод сялянства, якое яна ходзіцца пад падвойным уціскам, сьцімулюючы пасьляваньне нацыянальна-вызваленчых паўстаньняў супроць польскай акупацыі.

Узмацнілася кіруючая роля партыі на ўсіх вучастках рэвалюцыйнага фронту. Значных посьпехаў партыя дасягнула ў кіраўніцтве штодзённай барацьбой рабочай клясы, перш за ўсё эканамічнымі стачкамі.

Адначасова зьезд даў грунтоўную ацэнку працэсу разлажэньня ў буржуазным лягеры. Галоўныя сымптомы нарастаючага крызісу вяркоў—гэта далейшае абвастрэньне ня ўнутраных спрэчак, рэзкае зьмяншэньне масавай базы пілсудчыны, паўсюдны адыёз ад не дробна-буржуазных мас, значнае пазіцыяльнае і дэмаралізацыя ў нізавых праслойках дзяржапарату, а таксама ідэйны разброд сярод гэй часткі інтэлігэнцыі, якая далучаецца да лягеру пілсудчыны.

Усе гэтыя зрухі азначаюць, што Польшча, у якой асабліва яркі выступае канец апошняй стабілізацыі капіталізму, «падыходзіць шчыльна да рэвалюцыйнага крызісу». Але гэты падыход, які ня мае вічога агульнага з аўтаматычным скачком, адбываецца на ўмовах нерэўнамернасьці, частковай зьмагаватасьці працэсу, у абстаноўцы згуртаваньня ўсіх сіл контр-рэвалюцыі, пацёку падзвычай разбухлага ваенна-фашысцкага апарату, узрослых труднасьцяй і значных яшчэ хістаньняў у масах.

Адсюль устаноўка зьезду на разгортваньне эканамічных і палітычных ставак, на заваяваньне кіруючай ролі па ўсім фронце барацьбы пралетарыяту і эксплёатаванага сялянства, на ліквідацыю масавай базы сацыял-фашызму і на паскораны тэмп заваяваньня большасьці пралетарыяту.

Выходзячы з гэтай устаноўкі, зьезд аддаў асаблівую ўвагу слабым вучасткам партыйнай работы, ускрыў рад яе недахопаў і правёў пасьлядоўную бальшавіцкую самакрытыку. Асаблівую труднасьць у разьвіцьці масавых баёў прадстаўляе, апрача шалёнага фашысцкага тэрору, лоўкае маскіраваньне сацыял-фашызму, які стараецца аблягчыць буржуазіі капіталістычны выхад з крызісу пад прыкрыцьцём фраз аб «дэмакратычным» выхадзе. Чым бліжэй набліжаецца рэвалюцыйны крызіс, тым больш радыкальнай становіцца фразеалёгія сацыял-фашыстаў, выступаючых з «прынцыповай непрымірымасьцю» супроць капіталізму, за «сацыялістычную плянавую гас пацарку», «супроць улады капіталістаў і памешчыкаў, за ўладу рабочых і сялян», для таго, каб, захоўваючы ўплыў сярод мас, «упікнуць катастрофы», г. зн. выратаваць капіталізм ад пралетарскай рэвалюцыі. Гэтым таксама акрэсьліваецца паўны паварот у стачачнай тактыцы сацыял-фашыстаў: Замаскаванае штрэйкбрэхэрства, якое праводзіцца пры дапамозе ўзначаленьня нямінучых стачак для іх зрыву.

Даўшы разгорнутую характарыстыку сацыял-фашысцкіх манэўраў, зьезд падкрэсьліў, што гэмп разлажэньня сацыял-фашызму не адпавядае ўзроўню рэвалюцыйнага ўздыму.

Партыя павінна сыстэматычна выкрываць і своечасова параліжаваць сацыял-фашысцкія манэўры на вузьце штодзённай барацьбы, якая ва ўмовах канца капіталістычнай стабілізацыі зьяўляецца «асноўным зьвяном падвядзеньня мас да падыходзячых буйных рэвалюцыйных баёў» (з пастановаў XII пленуму ВККІ).

Таму ў цэнтры зьезднаўскай дыскусіі стаялі пытаньні пашырэньня самастойнага кіраўніцтва стачкамі, шырокага ўжываньня тактыкі адзінага фронту зьнізу, уменьня шырока зьмяняць формы і мэтады барацьбы, падхапляць формы, якія высоўваюцца масамі, з тым, каб згодна ленінскага прынцыпу «ўсе яны разам вялі да больш глыбокага і рашучага канфлікту» і каб «павышэньне форм заставалася пастаянным тэндэнцыяй». Дыскусія выявіла рад правых і «левых» памылак, якія на-ходу выпраўляюцца партыяй.

Падкрэсьліваючы адставаньне руху беспрацоўных ад занятых рабочых, зьезд даў партыі выразныя дырэктывы аб разгортваньні масавай барацьбы беспрацоўных і ўвязці іх з забастовачным рухам.

У якасьці ўдарнай задачы зьезд паставіў перад партыяй узмацненьне работы сярод сялянскіх мас, указаўшы на арганізацыйную слабасьць партыі ў польскай вёсцы. Зыходным пунктам гэтай работы павінна быць сыстэматычная арганізацыя адпору ўсякім формам эксплёатацыі ня толькі сялянскай бедноты, але і пераважнай часткі серадняцтва, якое руйнуецца даўгамі і падаткамі, варожа настроена супроць памешчыкаў і кулакоў. Цэнтральным-жа зьвяном тактыкі зьяўляецца сямельны голад, у які ўпіраюцца ўсе формы сялянскай барацьбы.

Увязка барацьбы за зямлю бяз выкупу ва ўсіх яе канкрэтных праяўленьнях з лёзунгам рабоча-сялянскага ўраду і са штодзённай барацьбой пралетарыяту ўмацуе на справе рэвалюцыйны саюз рабочых і сялян. Улічваючы гэту необходнасьць, больш пранырлівыя правадыры кулацкіх партый, якія прапаведуюць «клясавае братэрства сялянства», гатовы былі-б [illegible] на словах лёзунг зямлі бяз выкупу, каб аслабіць, параліжаваць рост камуністычнага ўплыву ў вёсцы. Ва ўсю шырыню [illegible] паставлена ў парадак дня зьезду нацыянальнае пытаньне, асабліва пытаньне ўмацаваньня кіруючай ролі партыі ў нацыянальна-вызваленчым руху на Заходняй Украіне і ў Зах. Беларусі. Тут барацьба сялянскіх мас за зямлю баз выкупу накіравана перш за ўсё супроць польскіх памешчыкаў. Тут кожнае рэвалюцыйнае выступленьне мас наносіць удар польскаму імпэрыялізму. Тут партыя мабілізуе масы на барацьбу супроць польскай акупацыі пад асноўным лёзунгам: «Права нацыянальных народаў на самавызначэньне аж да аддзяленьня ад Польшчы», растлумачваючы ім, што шлях да ажыцьцяўленьня гэтага лёзунгу вядзе праз супольную барацьбу з працоўнымі Польшчы супроць фашысцкай дыктатуры. Партыя падводзіць масы да непасрэдной барацьбы супроць польскай акупацыі, заклікаючы пранікаць яе агентаў, уводзіць яначным парадкам родную мову ў школах, адкрываць школы, закрытыя фашысцкай уладай і г. д.

«Умацаваньне саюзу рабочай клясы Польшчы з працоўнымі масамі прынечаных народаў магчыма толькі пры ўмове, што пралетарыят, пад кіраўніцтвам КПП, будзе пястомна весьці штодзённую барацьбу супроць калёніяльнага рабству і ўціску, што ён будзе чула рэагаваць і актыўна падтрымліваць вызваленчую барацьбу прынечаных народаў супроць польскага імпэрыялізму» (з рэвалюцыі па нацыянальным пытаньні).

Як адну з важнейшых актуальных задач, зьезд высунуў арганізацыю масавых палітычных стачак, якія зьяўляюцца лепшым срэдкам увязкі пралетарскай барацьбы з рэвалюцыйным селянствам і нацыянальна-вызваленчым рух

РЫХТУЙЦЕ ЦЕПЛУЮ І СЫТУЮ ЗІМОЎКУ ЖЫВЕЛЕ

Калгас „Вольная праца“ ацяпліў хлявы і ўзяў кармы пад жорсткі кантроль

КАРМЫ ПАД ЗАМКОМ

«Вали колькі ўлезе, а там пабачым, павінна хапіць»... — такога прынцыпу прытрымліваліся мінулай зімой пры выдаткаваньні кармоў у калгасе «Вольная праца», Слуцкага раёну. Уліку кармоў ня было, таксама як і людзей, адказных за іх выдаткаваньне. Бралі хто колькі хацеў.

У сакавіку праўленцы ўжо блукалі па ўсёй акрузе і шукалі кармоў, плацілі за іх вельмі дорага. Прышлося нават разрываць строхі. Оваіх кармоў не хапіла.

Абязьлічка і безгаспадарчасьць у выдаткаваньні кармоў была і ў гэту восень. Толькі абвешчаная ЦК КП(б)Б самаправерка падрыхтаванасьці калгасных фэрм да зімоўкі ўскалыхнула калгасную масу. Калгасьнікі зразумелі, што мала сабраць і загатовіць неабходную колькасьць кармоў. Гэтым задача вырашаецца толькі напалову. Ня меншае значэньне мае арганізацыя правільнага і рацыянальнага скарыстаньня кармоў. Калгасьнікі зразумелі, што правільна выдаткоўваць кармы — гэта, па-першае, падлічыць, колькі іх застаецца ў гаспадарцы пасьля выкананьня сваіх абавязкаў перад дзяржавай. Пры гэтым падлічыць не наогул, а абавязкова ў кожным стагу, гумне, капцы і замацаваць кожны стог, капец і адрыну за адказнымі асобамі.

Пытаньне аб падрыхтоўцы калгасу да зімовага ўтрыманьня жывёлы падрабязна абгаворвалася на пашыраным пасяджэньні праўленьня сумесна з рэвізійнай камісіяй і калгасным актывам. Пасьля шматчасовых спрэчак, калі на калгасных дварох ужо пачалі пераклікацца пеўні, выбрали спэцыяльную камісію, якой даручылі падлічыць кармы і склясьці кармовы баланс. Камісія пры дапамозе ўсяго калгаснага актыву пачала в выяўленьні і падліку ўсёй наяўнай колькасьці кармоў. Былі занумараваны, падлічаны і абмераны кожны капец, кожны стог і гумно. Вынікі абмеру запісваліся ў спэцыяльны спытак. Так, падлічылі ўсё сена, канюшыну, 5 капцоў і склеп з бульбай, сілас, сьцірту і чатыры гумны азімай саломы, яравую салому і г. д. Моцныя кармы падлічылі на аснове даных аб ураджаі і абмалоце.

Пасьля гэтага камісія падлічыла нагалоўе на малочнай фарме, у сьвінарніку, стайнях, а таксама і жывёлу, якая знаходзіцца ў асабістым карыстаньні калгасьнікаў. Усю жывёлу падзялілі на групы па ўзросьце і вызначылі тэрміны карміленьня для розных груп. Напрыклад, для рабочых коняй выключылі 200 кармовых дзён, ад 25 лістапада (дзень пачатку работы камісіі) на 15 чэрвеня для малацьбы старэй аднаго году — 170 кармовых дзён; для цялят нараджэньня 1933 г. — 100 дзён; для нарасят — 40 дзён і г. д.

Зрабіўшы падлічэньні ў пасевных, страхавых фондах, вызначыўшы для здачы (продажу) дзяржаве, паводле пляну, камісія прыступіла да складаньня норм, на якіх трэба карміць аграмаджаную жывёлу. Разам з гэтым вылучылі неабходны мінімум кармоў для разьмеркаваньня паміж калгасьнікамі па працадзнёх.

Пры вызначэньні норм камісія сутыкнулася з наступным фактам. У сьвінарніку пры пераводзе на дарослае нагалоўе ёсьць 20 штук сьвіней. Ня гледзячы на гэта, сьвінарамі кожны дзень выдаткоўвалася акрамя высеваў на 20—25 пудоў бульбы — больш пуда бульбы на штуку. Між тым, у калгасе, прымаючы пад увагу наяўнасьць бульбы, можна выдаткоўваць штодзённа не больш 10 пудоў. Такі-ж малюнак выдатваньня кармоў камісія выявіла і ў аборы і стайні.

Пасьля вызначэньня норм кармы былі замацаваны за фэрмай, сьвінарнікам і стайняй. Напрыклад, загадчыку малочнай фэрмы таў. Пятровічу было перададзена 453 цэнтнэры мурожнага сена, 126 цэнтн. лугавога сена, 128 цэнтн. паўбалотнага, 448 цэнтн. канюшыны, 482 цэнтн. яравой саломы, 204 цэнтн. мякіны, 413 цэнтн. азімай саломы, 7 цэнтн. моцных кармоў і 945 цэнтн. сілясу.

За фэрмай замацаваны пэўныя капцы і гумны, у якіх знаходзіцца ўказаная колькасьць кармоў.

Такім-жа чынам былі разьмеркаваны і замацаваны кармы і за старшымі конюхамі (у калгасе тры стайні) і старэйшым сьвінаром. Насенныя і кармовыя фонды, а таксама і кармы для выдачы калгасьнікам па працадзнёх замацаваны за членам праўленьня. Усе гэтыя тэварыны пэрсанальна нясуць адказнасьць за захаваньне і выдаткаваньне кармоў паводле вызначаных норм. Перадача кармоў афармлена адпаведнымі актамі.

Цікава спыніцца на зьмене адносін саміх калгасьнікаў да грамадзкай уласнасьці, якая назіралася ў часе работы камісіі. Пасьля падліку кармоў і замацаваньня іх, кожны сачуў сябе гаспадаром. Пачалі думаць аб замках, ключох, сталі цікавіцца нормамі карміленьня, па якіх нормах карміць жывёлу. Кожны воз сена, які прывозілі з гумна, ужо быў абчосан як належыць. Па дарозе ўжо не валялася ні адзэй жмені сена ці саломы, як гэта было раней.

На малочнай фэрме, у сьвінарніку і стайнях вывешаны нормы, па якіх трэба карміць жывёлу, выходзячы з наяўнасьці кармоў.

Калгасьнікі, якія працуюць на фэрме, разам з камісіяй распрацавалі парадак скарыстаньня кармоў, іх падрыхтоўкі, вызначылі часы карміленьня, паеньня і выгану на прагулкі. На малочнай фэрме ў часе работы камісіі была ўвесьдзена зьдзельшчына ад літра надоенага малака, а на сьвінарніку ад колькасьці народжаных і выгадаваных парасят і ад цэнтнэра жывой вагі пры адкорме.

Шмат увагі аддалі калгасьнікі адзяленьню пасяжаньняў. У аборы і ў сьвінарніку зрабілі столі, а сьцены стайняў абклалі саломай.

Трэба памятаць, што кароба, напрыклад, якая знаходзіцца ў калодным аборы, выдае за зіму на 2,5—3 цэнтн. больш, у параўнаньні з кароваю, якая знаходзіцца ў цёплай аборы.

Ад ацяпленьня адной толькі аборы калгас э'эканомліць каля 225 цэнтн. сена, якое пайшло-б на абаграваньне цела кароў у халоднай аборы. Ня кажучы шалёвы гэтай колькасьці калгас э'эканомліць ад ацяпленьня сьвінарніку і стайняў.

Зараз у калгасе справоўцца барацьба за кармушку для кожнай жывёлы. Калгасьнікі ўже ўсьвядомілі, што кожная кармушка на працягу зімы захоўвае ад 10 да 15 проц. кармоў.

Трэба адзначыць вялікую ачышчальную ў падрыхтоўцы да зімоўкі, якую правялі калгасьнікі арцелі «Вольная праца», асабліва старшыня калгасу тав. Рухавец, член рэвізійнай камісіі тав. Чайкун, член праўленьня калгасу тав. Дубіка Р. і рахункавод тав. Дубіна Аляксей.

На прыступы калгасу «Вольная праца» мы бачым, які эфэкт дае правільнае і рацыянальнае выдаткаваньне кармоў.

В. КРУГЛОЎ.

Пухавіцкія сьвінафэрмы не падрыхтаваліся да зімоўкі

ПУХАВІЧЫ. Пасасобным СТКФ раёну зусім не падрыхтаваліся да зімоўкі жывёлы. Пабудова новых сьвінарнікаў і хлявоў, ацяпленьне старых да гэтага часу не закончана. У пасасобных калгасах распачатае будаўніцтва пад пагрозай зрыву.

Так, у калгасе «Чырвоны Бор», Пакасельскага сельсавету, пабудова хлявоў не заканчваецца толькі таму, што «не хапае» саломы. У калгасах: «Ураджайны край», Пухавіцкага сельсавету, «Чырвоны Кастрычнік», Блужанскага сельсавету, будаўніцтва, распачатае ў мінулым годзе, да гэтага часу ня скончана. Усё гэта—вынік таго, што пытаньню свачачовай падрыхтоўкі да зімы як калгасы, так і РКС не аддалі належнай увагі.

У калгасе «Дэкада абароны», Азярышчанскага сельсавету, сьвінгадоўчая фэрма знаходзіцца ў надзвычай безгаспадарчым становішчы. Сьвінарнікі—брудныя, сьвіньні стаяць у празі.

Ня лепш і з кармленьнем. Шмат якія калгасы пайшлі на шляху скарачэньня кармовага рацыёну. У калгасе «Сталінец», замест нормы ў 5 кгр. бульбы і 1 кгр. канцэнтрату, сьвіньні даюць штодзенна 4 кгр. бульбы і 300 грам канцэнтрату.

Кармовыя фонды ў радзе калгасаў ня створаны. У выніку гэтага певаторыя калгасы ўжо зараз адчуваюць недахват у кармох. Такое зьявішча асабліва можна назіраць у калгасе «Ураджайны край». Кармы сьвінафэрмы абязьлічаны і не перададзены загадчыку фэрмы.

Адсутнасьць кармовых фондаў, дрэнны догляд—усё гэта надзвычай пагубна адбілася на росьце сьвіннога стада. Адыход нарасят на пасасобных калгасах даволі знаны. Для прыкладу даволі ўзяць хаця-б такія калгасы, як «Чырвоная зьмена», дзе адыход складае 90 проц., «Першамайскі»—68 проц., «Сталінец»—78 проц.

Фэрмы раёну ўкамплектаваны толькі на 42,3 проц. Сьвіноматкавай фэрмы ўкамплектаваны на 50,9 проц.

Асноўнай прычынай неўкамплектаванасьці зьяўляецца абязьлічка ў догляде і незацікаўленасьць загадчыкаў фэрм і сьвінароў у росьце пагалоўя.

З. Б.

Пэрсанальная адказнасьць

БАЎРУЙСК. Узорна падрыхтоўвалася да зімоўкі жывёлы брыгада малочнай фэрмы калгасу імя Будзённага, Валосаўскага сельсавету. Хлявы ацеплены. Для кожнай кароўы зроблена кармушка.

Абязьлічка на фэрме ліквідавана. За кожным закрэпленым жывёлы замацавана поўная група кароў. За работай дагляднікаў устаноўлен кантроль.

Вялікую ўвагу аддае калгас рацыянальнаму выкарыстаньню кармоў. Строга кантролюецца расходаваньне фуражу. Увесь кармовы фонд перадан пад адказнасьць загадчыка фэрмы. Карміленьне жывёлы правядзіцца паводле вызначаных норм. (БЕЛТА).

Сена расьцягваюць

ДУБРОЎНА. Перад поўнай МТКФ і СТКФ зараз стаіць даволі адказная задача—захаваць і правільна расходаваць кармы.

Але рад калгасаў бездапушчальна, па-палёгачэльнасьці адносіцца да захаваньня кармовых фондаў і іх расходаваньня. Прыкладам адсутнасьці бальшавіцкай барацьбы за кармовую базу зьяўляецца калгас імя Калініна, Іскоўскага сельсавету. Тут з прычыны злачынай бязьдзейнасьці праўленьня 12 кон сена згніло. Кармы ў калгасе не ахоўваюцца. Сена, якое знаходзіцца на сенавале, кожную ноч расрадаецца. У калгасе таксама маюць месца і вытадкі разбазарваньня кармоў. Кармы дадзена жывёле бяз нормы і бяз усякага ўліку.

Усе прыведзеныя факты стварацоць пагрозу для нармальнай зімоўкі жывёлы ў калгасе. (БЕЛТА).

тоўкі падобных выступленьняў рабочай кляасы. Вопыт 16 сакавіка паказаў таксама вялікія магчымасьці арганізацыі забастовак сярод мэталістаў і чыгуначнікаў—гэтых важнейшых атрадаў пралетарыяту ў барацьбе супроць наступленьня капіталу і пагрозы новай вайны.

Значнае месца ў зьездаўскіх спрэчках заняла пытаньні антываеннай кампаніі і работы ў арміі. Адзначаючы паскораную падрыхтоўку польскага імпэрыялізму да вайны, якая маскуецца папыфіцкімі фразамі фашыстаў і сацыял-фашыстаў, зьезд заклікаў партыйныя арганізацыі да ўзмацненьня барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны, у абарону СССР, і выпрацаваў рад канкрэтных дырэктыў.

Зьезд абазваў усе партарганізацыі, усіх членаў партыі і КСМ дабіцца рашучага пералому ў рабоце сярод салдат, разглядаючы яе слабасьць, як тыповае праяўленьне апартуністычнай недаацэнкі ваеннай небясьпекі і абвастрэньня палітычнай сітуацыі.

«Барацьба за армію, якая ўсё часьцей фашызуецца урадам па ўнутраным фронце, будзе мець рашаючае значэньне для перамогі пралетарскай рэвалюцыі»,—гаворыцца ў рэзалюцыях зьезду.

У галіне арганізацыйных посьпехаў вялікім дасягненьнем зьяўляецца падваеньне ліку членаў партыі і камсамолу з часу V зьезду. У нелегальных умовах КПП стала сапраўды масавай партыяй. Аднак, задача стварэньня моцнай базы на важнейшых прадпрыемствах яшчэ не вырашана.

Буйнейшы недахоп, што выступае ўсё вастрэй у сувязі з забастовачнай хваляй—гэта арганізацыйная слабасьць рэвалюцыйнага прафруху. Пашырэньне сеткі чырвоных прафсаюзаў, фабзычных груп прафпазыцыі і ўпартая барацьба за масы ў рэфармісцкіх, хрысьціянскіх і інш. прафсаюзах становіцца неабходнай умовай умацаваньня сувязі камуністаў з масамі і моцнасьці посьпехаў у стачачным руху.

Рэвалюцыйны ўдым і шалёны фашысцкі тэрор паставілі перад зьездам задачу палепшэньня ўсёй сыстэмы кіраўніцтва, перабудовы штодзённай работы партыі, яе практыкі ў тым кірунку, каб кожны крок партыі і кожнае яе дзеяньне натуральна вялі да рэвалюцыйнага выхаваньня мас, да падрыхтоўкі рэвалюцыі.

Галоўная прадпасылкі бальшавіцкай сыстэмы кіраўніцтва—гэта выразная канкрэтызацыя задач, своячасовая ініцыятыва ўсіх зьвеньняў партыі, умелае разьмеркаваньне працы, шырокая пераразпрацоўка вопыту, пастаянны жывы інструктаж, дакладны кантроль выкананьня, сьмелае высоўваньне кадраў, няўхільнае захаваньне канспірацыі і рашучая барацьба з правакацыяй.

У галіне барацьбы з ухіламі зьезд заваструў увагу партыі на канкрэтных праяўленьнях найбольш небясьпечнага, правага апартуністу, асабліва ў адносінах да сацыял-фашысцкіх маневраў, і на сэктанцкім падыходзе да рабочых з варожых арганізацый.

Апрача таго зьезд падкрэсьліў небясьпеку трацкізму. У непапраўных правых фракцыянэраў гэта ідэалёгія перарасла ў контр-рэвалюцыйны трацкізм. Правыя дэвіяцыяністы зрабіліся яго кантрабандыстамі ўнутры партыі. Пляцформа праватрацкісцкага блёку, які паставіў сябе па-за радамі партыі, прадстаўляе сабой сумесь правых канцэпцый трацкісцкіх поглядаў. Яна лічыць сацыял-фашысцкія партыі выказьнікамі дробнабуржуазнай дэмакратыі, «часовым саюзьнікам», з якім кампартыя павінна заключыць кампраміс і стварыць блёк, накіраваны супроць фашызму. Ясна, што антыпартыйная, рэнэгацкая дзейнасьць гэтай групы, якая прадстаўляе на справе агентуру сацыял-фашызму, выкарыстоўваецца ахраннай Пілсудзкага для барацьбы з кампартыяй. Маральна-палітычную адказнасьць за гэту групу нясуць Варскі і Костэцэва, якія да гэтага часу не капітулявалі перад партыяй.

Заканчэньнем работ VI зьезду было прыняцьце праграмы партыі. Грунтуючыся на праграме Камінтэрну, праграма кампартыі Польшчы ў сьціслым выдзе дае аналіз інжэрыялізму і фашызму, рухомых сіл і характару пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы, падае задачы гэтай рэвалюцыі і савецкай улады пасьля яе перамогі, а таксама асноўныя моманты стратэгіі і тактыкі кампартыі Польшчы. Характар пралетарскай рэвалюцыі ва ўсёй польскай дзяржаве, праграма вызначае як сацыялістычны з вялікім абёмам задач буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, асабліва на Заходняй Украіне і ў Заходняй Беларусі. Дыскусія на зьезьдзе спрыяла канкрэтызацыі гэтых задач, без пасьлядоўнага вырашэньня якіх немагчыма пераможная сацыялістычная рэвалюцыя. Праграма КПП, канчатковую прапрацоўку якой зьезд даручыў ЦК, стане пуцеводзіцелем ня толькі для партыйных радоў, але і для шырокіх мас працоўных Польшчы ў барацьбе за рэвалюцыйны выхад з крызісу.

Рэвалюцыйную пэрспэктыву ў Польшчы зьезд увязаў з усёй міжнароднай абстаноўкай, перш за ўсё са становішчам у Германіі. Зьезд поўнасьцю сабе ўявіў, што вуглавым пунктам нарастаньня рэвалюцыйнага крызісу ў капіталістычных краінах Эўропы зьяўляецца Германія як па сваім міжнародным становішчы, так і па напружаньні ўнутраных супярэчнасьцяй і па ўдзельнай вазе германскага пралетарыяту. Рэвалюцыя ў Польшчы цесна зьвязана з рэвалюцыяй у Германіі. Таму зьезд абазваў ЦК усталяваць прыкмяты сувязі з КПГ шляхам сумеснай барацьбы супроць вэрсальскай сыстэмы і нацыяналістычнага цкаваньня, якое вырастае на глебе польска-германскіх імпэрыялістычных супярэчнасьцяй.

Работа, якую прарабіў VI зьезд на ўмовах рэвалюцыйнага пералому ў Польшчы, дапаможа кампартыі Польшчы стаць сапраўдным правадыром мільённых мас у барацьбе за зьвяржэньне крывавай дыктатуры буржуазіі.

АГЛЯД ДРУКУ

А збожжа—ні аднаго кілё

„КАЛГАСЬНІК ПЯТРЫКОЎШЧЫНЫ“

1 сьнежня:

«ПА ЦЬВЁРДЫХ ЗАДАНЬНЯХ — 33 ПРОЦ.».

5 сьнежня:

«ПА ЦЬВЁРДЫХ ЗАДАНЬНЯХ — 33 ПРОЦ.».

Так, з дазволу сказаць, спаганяюцца цьвёрдыя заданьні ў Пятрыкоўскім раёне. За цэлых пяць дзён — ні аднаго грама збожжа. Весткі ўзяты з раённай газэты. Акуратна праз кожную пяціднёўку «Калгасьнік Пятрыкоўшчыны» паведмляе аб адным і тым-жа факце. 10 сьнежня, апрыклад, «КП», як і пяць дзён назад, лёканічна адзначыў:

«ПА ЦЬВЁРДЫХ ЗАДАНЬНЯХ — 33 ПРОЦ.».

Гэты занятак яўна падабаецца рэдакцыі. І запраўды, што можа быць лягчэй за паўтарэньне аднэй незьмешнай лічбы? Мімаволі прыходзіцца настаражыцца. Адкуль такая, скромная кажучы, абыякавасьць да кулацкага сабатажу? За адказам ня трэба далёка ісьці. Даволі азнаёміцца з камплектамі «К. П.»...

Возьмем, для прыкладу, адносіны рэдакцыі да Асавецкага сельсавету. Практыка гэтага сельсавету ярка паказвае, чаму раён ганебна адстае па збожжазагатоўках. У сельсавеце адкрыта зьмырыліся з кулацкім сабатажам. Зьмырыліся і... пайшлі на паклон да кулака. Пайшлі і... сьлёзна прасілі здаваць збожжа дзяржаве. Сельсавет арганізаваў спэцыяльныя палворныя абходы кулацка-заможных гаспадарак, УПРОШВАЮЧЫ кулакоў... ня зрываць збожжазагатовак.

Факты гавораць самі за сябе. Інакш як здрадай партыі, як простым саюзам з кулаком, гэтага не назавеш. Ня так думае рэдакцыя «К. П.». Праўда, яна разка крытыкуе сельсавет за яго паклоны перад кулаком. Праўда, яна горача абураецца тым, што

«... сельсавет пачаў рабіць ПАДВОРНЫЯ АБХОДЫ КУЛАКОЎ і УПРОШВАЦЬ іх здаваць збожжа...»

Але... гара нараджае мыш. Газэта велікадушна даруе здрадзікам партыі, што акапаліся ў сельсавеце, іх саюз з клясавым ворагам. Рэдакцыя ня робіць ніякіх вывадаў. Людзям, стаўшым на калені перад кулацкімі элемэнтамі, даецца пашпарт на... далейшае кіраўніцтва сельсаветам. Рэдакцыя нават і ня думае ўзьнімаць пытаньня аб тым, што трэба неадкладна зьмяніць кулацкае кіраўніцтва сельсавету, які, паводле яе ўласных слоў, «страціў сваю клясавую пільнасьць». Ні адно прозьвішча не называецца.

«Нельга прымірэнча адносіцца да кулацкага сабатажу...», —

вось першы і апошні вывад з усіх гэтых фактаў.

Ясна, што ад такіх вывадаў кулацкім прыхваснем з Асавецкага сельсавету ні горача, ні холадна.

Так разумее «Калгасьнік Пятрыкоўшчыны» барацьбу з кулацкім сабатажам. І гэта пасьля урокаў Кубані! І гэта ў той час, калі ў раёне ў выніку апартуністычнага прымірэнцтва да кулака збожжазагатоўкі праходзяць зусім ДРЭННА!

Асавецкі сельсавет — не выключэньне. Палітычную блізарукасьць «К. П.» можна праілюстраваць і радам іншых фактаў. Як толькі справа даходзіць да канкрэтнай барацьбы з кулацкім сабатажам, рэдакцыя закрывае рот.

Газэта сыгналізуе, што ў тым ці іншым сельсавеце цацкаюцца з кулаком, што збожжазагатоўкі зрываюцца, а спэкулянты бесьперашкодна перакупляюць збожжа і... ніяк ня можа зьвязаць канцы з канцамі. Яна то закрычыць аб прымірэнцтве да кулацкага сабатажу, але не назаве ні аднаго канкрэтнага прымірэнца. То ўдарыць у набат аб спэкуляцыі збожжам, але ня выкрые ні аднаго патуральніка спэкуляцыі. Самі шукайце. Самі дагадвайцеся.

20 верасьня рэдакцыя «К. П.» пісала, што ў Бабуніцкім сельсавеце

«... кулакі і заможнікі прадаюць збожжа на прыватным рынку па спэкуляцыйных цэнах. Па цьвёрдых заданьнях НЕ ПАСТУПІЛА НІ АДНАГО КІЛЁ ЗБОЖЖА. Масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў на барацьбу са спэкулянтам не мабілізаваны.

Апартуністычнай бязьдзейнасьці павінен быць пакладзен канец».

Каго вінаваціць у гэтым? Хто патурае спэкуляцыі збожжам? Чаму кулацкі сабатаж не сустракае ніякага адпору? Нарэшце (і гэта асабліва важна) як рэагуюць райком і РВК на становішча ў сельсавеце? «Калгасьнік Пятрыкоўшчыны» маўчыць. Маўчыць месяц, маўчыць два...

6 сьнежня раптоўна зьяўляецца заметка пад мэлянхалічным загалоўкам «У Бабунічах бяз зьмен». Загаловак цалкам адпавядае зьместу. Аказваецца, у сельсавеце

«... ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК ПА АДНААСОБНЫМ СЭКТАРЫ ВЫКАНАН НА 36 ПРОЦ., А ПА ЦЬВЁРДЫХ ЗАДАНЬНЯХ УСЯГО НА 6 ПРОЦ.

Сельсавет ня прыняў ніякіх рашучых мер, каб у тэрмін спагнаць цьвёрдыя заданьні.

Чым інакш, як не апартуністычным патураньнем кулацка-заможнай частцы вёскі, можна растлумачыць такое ганебнае становішча»?

Усё! Рэдакцыя зарэгістравала факт—«у сельсавеце бяз зьмен». Газэту ніколі ня цікавіць, што за людзі сядзяць у сельсавеце, які «апартуністычна патурае кулацка-заможнай частцы вёскі». І на гэты раз прозьвішчы і імёны бясьсьленка зьнікаюць са старонак «К. П.». Зноў ніякіх вываду. Зноў ні слова аб канкрэтных праваднікох кулацкай лініі. Як тады ў верасьні, так і цяпер — ні радка аб раённых арганізацыях, нібы яны не адказваюць за кулацкую практыку ў сельсавеце!..

«Бязьлітасна змагаючыся з кулаком, разьбіваючы кулацкі сабатаж, арганізуючы масы на правядзеньне збожжазагатовак,—дабіцца ў бліжэйшы час стопроцантнага выкананьня пляну».

Падобнымі фразамі запоўнены ўсе перадавіцы «К. П.», усе рэдакцыйныя артыкулы аб збожжазагатоўках. На агульныя словы, на алілюйскія разважаньні рэдакцыя ня скупіцца. У гэтым, па сутнасьці, і заключаецца ўся барацьба «К. П.» за збожжа. Рэдакцыя займаецца выключна тым, што па-першае, — горача, з зайздросным запалам заклікае «зламаць», «разьбіць», «ударыць» (на кім канкрэтна — сакрэт самой газэты), а, па-другое, — спакойна і бязудзельна фіксуе адны і тыя-ж факты.

«К. П.» № 43 (25 лістапада).

Факты:

«За апошнюю пяціднёўку мы маем РЭЗКАЕ ЗЬНІЖЭНЬНЕ ТЭМПАЎ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК».

Прычыны:

«Адсутнасьць работы з актывам і АДСУТНАСЬЦЬ РАШУЧАГА НАЦІСКУ на кулацка-заможную частку вёскі».

Вывады:

«Даб'емся ў бліжэйшы час стопроцантнага выкананьня пляну збожжазагатовак».

«К. П.» № 45 (6 сьнежня).

Факты:

«Тэмпы збожжазагатовак па аднаасобным сэктары ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫЯ. Яшчэ горшае становішча са спагнаньнем збожжа па цьвёрдых заданьнях».

Прычыны:

«У РАДЗЕ сельсаветаў НЯМА НІЯКАГА НАЦІСКУ на кулацка-заможную частку вёскі»

Вывады:

«Да аб'яднанага пленуму РК і РКК КП(б)Б мы павінны прысьці з перамогай на фронце збожжазагатовак».

«К. П.» № 46 (10 сьнежня).

Факты:

«Ход збожжазагатовак па нашым раёне ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫ. За апошнюю пяціднёўку аднаасобны сэктар НЯ ЗДАЎ НІ АДНАГО КІЛЁ ЗБОЖЖА. Па цьвёрдых заданьнях таксама за дзьве апошнія пяціднёўкі НЕ ПАСТУПІЛА ні аднаго кілё збожжа».

Прычыны:

«Як і раней, РАД сельсаветаў і ячэек ігнаруюць аднаасобны сэктар. НЯМА НАЦІСКУ на кулацка-заможную частку вёскі».

Вывады:

«Да аб'яднанага пленуму РК і РКК КП(б)Б мы павінны прыйсьці з перамогай на фронце збожжазагатовак».

І так з нумару ў нумар!.. Што тут падобнага да барацьбы з кулацкім сабатажам? Нічога. Тут адна алілюйшчына, адно пустазвонства.

У раёне фактычна спынілася загатоўкі. За цэлую пяціднёўку па аднаасобным сэктары, як піша сама рэдакцыя, не загатоўлена «ні аднаго кілё». А газэта толькі перапявае сваю нудную абязьлічаную фразу аб «радзе сельсаветаў і ячэек».

У раёне зусім не спагняюцца цьвёрдыя заданьні. Кулакі не здаюць збожжа, а газэта толькі ў пязьлічоны раз нагадвае аб «адсутнасьці рашучага націску».

Так рэдакцыя «ламае», «разьбівае», «ударае» і «дабіваецца»... Зброяй служаць усяго два словы: «рад» і «адсутнасьць»...

Апэньваючы 6 сьнежня агульнае становішча са здачай збожжа, «Калгасьнік Пятрыкоўшчыны» пісаў, што

«... па Капаткевіцкім, Гапоўчыцкім, Макарыцкім і Брынеўскім сельсаветах ТОЕ-СЁЕ зроблена, а па ўсіх іншых (у раёне — 25 сельсаветаў) — НІЧОГА».

«Тое-сёе» і «нічога». Так газэта паказвае работу сельсаветаў. Ня меншая скромнасьць праяўляецца і ў адносінах рабіных арганізацый. Аб іх рабоце, аб іх кіраўніцтве «К. П.» ня піша. Газэта па-сяньнему маўчыць. Рэдакцыя хоча адыграцца толькі на адным таямнічым «радзе». Не падабаецца газэце самакрытыка. Не падабаецца!

Не агульнымі, хоць і самымі нарачыстымі заклінаньнямі, вымяраецца клясавая бязьдзейнасьць тэй ці іншай газэты, яе ўдзел у барацьбе за збожжа, супроць кулака. «К. П.» пазадварот, усю справу зводзіць да адной бескарыснай балбатні. Як тая сарока, рэдакцыя бясконца паўтарае: няма націску на кулака, няма, няма... А збожжа на ранейшаму—ні аднаго кілё. І ня дзіва. Газэта ня выводзіць на чыстую ваду ні аднаго сабатажніка, ні аднаго кулацкага агента — здрадніка партыі.

Закончым словамі самой рэдакцыі:

— «Тое-сёе» «Калгасьнік Пятрыкоўшчыны» аб збожжазагатоўках хоць і пісаў, але па сутнасьці не зрабіў «нічога»!..

ЧАРНЯЕЎ НЕ ЗДАЕЦЦА

(Ліст з Віцебску)

Калі ў пасьцэнгазэце зьявілася мая першая выкрывальная заметка аб бескантрольнай выдачы грошай у Віцебскай канторы ВЭО, дык заг. канторы інжынэр Чарняеў выступіў на агульным сходзе, абвінавачваючы мяне ў дэзарганізацыі і падкопваньні. Ён таксама зьмясьціў у пасьцэнгазэце артыкул, у якім пісаў:

«У нашай канторы ёсьць група крыкуноў, якія не разьбіраюцца ні ў гаспадарках, ні ў палітычных справах і адважваюцца крытыкаваць мяне, як члена партыі і інжынэра» і г. д.

На маю другую заметку аб тым, што для лепшага абслугоўваньня рабочых вашай канторы я пераходжу на 8-гадзінны рабочы дзень, пасьледавай такі выбрык: у часе падлікаў па зарплаце а 4-ай гадзіне дня таў. Чарняеў запрапанаваў скончыць работу. Калі я яму заявіў, што разьлікі трэба закончыць, інакш заўтра будзе сарвана выплата зарплаты, тады Чарняеў аблаяў мяне і пагразіў вывесьці з міліцыянэрам. Гэты ўчынак тав. Чарняева разглядаўся на прэзыдыуме гарпрафсавету, дзе на яго было накладзена адпаведнае спагнаньне.

Калі з-за нядбайнасьці і злачыннай бязьдзейнасьці тав. Чарняева была сарвана выплата зарплаты рабочым і аб гэтым была ў пасьцэнгазэце зьмешчана заметка старшыні заўкому тав. Папковіча, дык тав. Чарняеў накінуўся на мяне, як на старшыню рэдкалегіі. Калі аднойчы старшыня заўкому тав. Папковіч зьявіўся ў кантору, Чарняеў накінуўся на яго з грубай лаянкай і ў прысутнасьці многіх рабочых і служачых заявіў: «Вон з канторы, а то выведу з міліцыянэрам».

Калі т. Урбан—адзіны кваліфікаваны мал пёр—зьявіўся да тав. Чарняева за атрыманьнем свайго чарговага водпуску, зноў вы шаў скандал: «хам, сволач, падлюга, пашоў вон з габінэту».

Я напісаў аб гэтым у газэту «Віцебскі пралетары». Апрача таго я пісаў аб тым, што звальненьне кваліфікаваных рабочых па ўласным жаданьні санкцыянуецца лёгкай рукой; што ніхто не клапоціцца аб паляпшэньні бытавых умоў рабочых; што з-за нядбайнасьці адміністрацыі БЭО нас адмаўзалі ад сталоўкі; што прыработкі выдаюцца са спазьненьнямі на некалькі месяцаў, і рабочыя ня ведаюць, колькі яны зарабілі; што існуе абязьлічка і ўраўнілаўка; што замест запраектаваных 12 проц. даходу, мы маем на нашых работах страты, а накладныя выдаткі ў сувязі з лішняй трэцай сродкаў перавышаюць плянавыя на 50 і больш проц.; што замест меркаванай запазычанасьці ў 10.000 руб. мы маем 30.000, пры прэмфінпляне ў 50.000 руб. на квартал і ніхто нічога ня робіць для рэалізацыі грошай.

Гэта карэспандэнцыя праляжала ў рэдакцыі паўтара месяца і толькі па маім дамаганьні работнікі рэдакцыі т. т. Гутман і Міхно склікалі агульны сход, на якім усе факты, указаныя ў заметцы, пацьвердзіліся. Здавалася-б, што трэба прасачыць за зьнішчэньнем гэтых пенармальнасьцей, аднак, рэдакцыя «ВП» палажыла гэту справу пад сукно.

Не атрымаўшы ніякага падтрыманьня ад рэдакцыі, я праз месяц пакраваў карэспандэнцыю ў газэту «Зьвязда», якая зьмясьціла матар'ял 19 лістапада 1932 г.

Рэдакцыя «Віц. пралетара» тлумачыць сваё маўчаньне тым, што чапіцца да Чарняева яны ня хочуць і перадалі матар'ял у КК-РСІ.

І вось Чарняеў, карыстаючыся алёкай рэдакцыі, «дэйнічае» далей. Звальняюцца маладыя рабочыя камсамольцы—былы бяспры тульны Клімаў і толькі што пераведзены з вучняў у рабочы разрад Сільвэстровіч—за тое, што яны адмовіліся ехаць для работы з брыгадзірам Капойка, гультаём і п'яніцай. Тав. Клімаў выкрываў у пасьцэнгазэце п'янства Капойка па мантажы ў Чапніках, дзе ён разам з ім працаваў. Аб гэтай заметцы ведаў тав. Чарняеў, але не захацеў лічыцца з камсамольцам-рабкорам і звольніў яго.

Далей, дэфіцытны матар'ял—драты і шнур, неабходныя для вытворчасьці, разбазарваюцца Плятманам, з якім Чарняеў мае інтымныя справы (п'янства і інш.).

Хаця заметкі пасьцэнгазэты пацьвярджаюцца на ўсе 100 проц., аднак, на іх ніхто не рэагуе.

Рубін.

Казлоў застаўся непакараным

(Ліст калгасьнікаў)

За апошні час на старонках «Зьвязды» было надрукавана некалькі рабселькораўскіх лістоў аб нашым Скепінскім сельсавеце, Жлобінскага раёну, аб яго кіруючых работніках. У рэзультаце рэагаваньня на гэтыя лісты зьняты з работы старшыня сельсавету Кругаўцоў і загадчык хаты-чытальні.

Нямала таксама пісалася ў раённым і цэнтральным друку аб адным з асноўных герояў скепінскіх злачынных спраў, старшыні калгасу «Пераможца»—Казлове. Толькі невядома чаму ён застаўся непакараным.

Блізарукасьць і бязьдзейнасьць раённых арганізацый у адносінах да яго, Казлоў выкарыстаў для таго, каб адомсьціць актыўным селькорам. Пасьля апублікаваньня ў цэнтральным друку апошняй заметкі аб Казлове, ён, сустрэўшы селькорку Шуберт, вылаяў яе самымі зьневажальнымі словамі і, урэшце, пагразіў:

— Больш ты з калгасу не атрымаеш ні аднаго грама прадуктаў. Можаш карыстацца прыватным рынкам.

Ужо было нямала выпадкаў простага зьдзекваньня пасобных членаў праўленьня з некаторых служачых калгасьнікаў. Напрыклад, мясцоваму настаўніку Вітко праўленьне калгасу катэгарычна адмовіла ў забесьпячэньні прадуктамі. А ў гэты-ж час былы загадчык хаты-чытальні, зяць не працуе ў калгасе, атрымлівае адтуль усе патрэбныя прадукты.

Паводзіны старшыні калгасу Казлова, а таксама і ўсяго праўленьня, незразумелыя. Яны вынікаюць з таго, што Казлоў яшчэ ў 1931 г., ня будучы ў калгасе, плацёў больш 100 руб. падатку, быў адным з мацнейшых заможнікаў вёскі.

Мала чым адрозьніваюцца і астатнія кіруючыя работнікі калгасу: загадчык гаспадаркі—былы гандляр, уласьнік буйнага хутара; калгасны рахункавод—заможнік, цёсна кроўную сувязь з эмігрантамі—белымі

Узмроку сутарэньняў Варшавы

Газета «АБЦ» пачала ыетэматычна друкаваць нарысы «З жыцця распачлівай і жабрацкай Варшавы».

«ЧАРНЯКОЎСКАЯ ВУЛІЦА, 212. У двары маленькая цёмная хібарка. Прызыпівы хопад, дзьве бярлогі. У хібарцы туліцца сям'я каменшчыка Высоцкага, ужо на працягу паўтары год беспрацоўнага. 9 еда ноў. Бацькі і 7 дзяцей ва ўзросьце ад 8 да 16 год. Старайшы — восьмы сын пашоў у армію. Ані кавалка хлеба, ані вугалю. Продаваць няма чаго. Апошняя дошка з ложка спалена. Матка — чалавечы шкілет, высахшымі грудзьмі завярэвае ромік галоднаму дзіцяці. Што высмоча гэта дзіця з грудзёў, калі матка два дні сама нічога ня ела? Старэйшыя дзеці ў кутку ціха плачуць. У школу яны ходзіць ня могуць, бо толькі двое маюць параваныя бацінкі на нагах, а рэшта — зусім босыя. Яны прыгуць сырую тыкву — падарунак аднаго з суседзяў (згатаваць няма на чым)».

* * *

«ПРАМЫСЛОВАЯ, 2. Жанчына Кавальчук. Кацісьці ў гэтым-жа доме яна мела ўласную малочную краму. За няўзнос квартэрнай платы ня высяліті з магазыну, усё абстаўленьне якога стаіць на дварэ. Праз тры дні яна будзе выселена нават з гэтай кватэры — двух голых пустых пакойчыкаў на першым паверсе. Яна пяжыць з завязанай галавой пасьля прыпадку шаленства ад роспачы. Яна павінна ўтрымліваць 90-гадовага бацьку, 25-гадовага сына калеку (тубэркулёз касьці). Малодшы 15-гадовы сын яшчэ ходзіць у школу. Яна гаворыць: «Можа мне ўдасца прадаць дзьве старыя бочкі з пограбу. А што-ж далей?».

* * *

«НАВАГРУДЗКАЯ ВУЛІЦА. Я стукаюся ў дзьверы ў цёмным калідоры сутарэньня прыгожай камяніцы. У адказ чуцен ціхі енк. «Хто гэта — чаго?» — мінута ціцішні. Дзьверы адчыняюцца. Я ўваходжу ў сутарэньне. У 11 гадз. дня тут так цёмна, што ледзь-ледзь бачыш постаць пажылай жанчыны напоўку. Запальваю сьвечку. Панура сутарэньне, сьцены пакрыты цьвілю. Упасьніца гэтага памяшканьня, старушка Л. ляжыць на чымсьці, што некалі было ложкам, і прыкрываецца пахмэнямі. Гаварыць ёй цяжка — астма і пастаянны кашэль перапыняюць яе кожную хвіліну. Гэта ўдава чыноўніка — зараз жабрачка.

— Я пастаянна галодная, — кажа яна. Яна атрымлівае 15 злотых дапамогі ў месяц, з якіх добрую палову аддае за гэты куток...».

* * *

«КРАСІВАЯ ВУЛІЦА (назва аднэй з варшаўскіх вуліц). Прыгожы шматпавярховы дом. Ці-ж тут знаходзіцца сапраўдная галота, аднак...

Праходжу двор і па крутых сходах падымаюся ў мансарду (мэзанін). Пакойчык ня больш двух квадратных мэтраў. У даху невялічкае вакенца, некалькі паламаных крэслаў, адно ложка. Вельмі хопадна, але надзвычай чыста. Адчуваецца клапатлівая рука, якая захоўвае гэту апошнюю «маемасьць» інтэлігентнага жабрацтва. Мяне прымае 60-гадовая жанчына. Твар хворы, схудлы.

Гэта дачка паўстанца 1863 году, удава чыноўніка. Яе сына царская ўлада 17-гадовым хлапчукам павесіла ў часе вайны, прычым ледзь не павесіла і яе самую. Пры ёй яшчэ некалькі дзяцей-малек. 21-гадовая хворая на сухоты дачка, поўнасьцю паралізаваная і 19-гадовы сын — вар'ят, які заўсёды сьмяецца.

— Не магу ні на мінуту выйсьці з дому і пакінуць іх адных. З грамадзкай кухні (філянтрапічная арганізацыя) мне даюць адзін абед — звычайна вадзяністы крупнік. Гэта іх адзіны харч, але затое яны трацяць права на дапамогу. — Гэта нашчасная матка прабуе сёе-тое зарабіць усялякімі пачынкамі на інвалідным швейнай машыне.

— Мне іншы раз удаецца за тры дні зарабіць злоты (злоты каля 22 кап.), але гэта здараецца рэдка.

Марэй гэтай старушкі — атрымець хаця-б 30 злотых дапамогі ў месяц. Гэтага хапіла-б на сьвятло, апал і кватэру, а гэтадаць яны ужо прывыкні. Але гэтыя 30 злотых у месяц для трох чалавек — недасяжная сума — міф».

Бясьпрытульныя дзеці ў Лодзі

ВАРШАВА. З усіх польскіх гарадоў найбольш панярэчыла ад крызісу Лодзь. Нават фашысцкая і сацыял-фашысцкая проса не знаходзіць для яе іншай назвы, як «замаўчоры горад», «горад беспрацоўных», «трагічны горад» і г. д. І сапраўды, у Лодзі амаль што другі рабочы беспрацоўны. Армія беспрацоўных, асабліва бядотных рабочых, расьце жудасным разьмерам. Фашысцкае правасудзьдзе цьвёрда стаіць на варце прыватнай уласнасьці, на варце капіталістаў.

Асабліва ў страшэнных разьмерах расьце ў гэтым горадзе лічба бездомных дзяцей. Нават чорнасотная фашысцкая проса ў апошнія часы пачала біць трывогу з прычыны вялізарнага росту бяздомных дзяцей у Лодзі. Зразумела, фашысцкая проса робіць гэта не з-за любві да іх, а з-за страху за сваю шкуру, за лёс таго капіталістычнага ладу, той пажэрнай прагнілай сыстэмы, якая нарадзіла гэта зьявішча. Вось як эпідэмія «Газэта Варшавска» апісвае стаўленьне бясьпрытульных дзяцей у Лодзі, гэтага «найтрагічнейшага» з гарадоў сучаснай фашысцкай Польшчы.

«Калі наступіць ноч і апусьцеюць вуліцы, — пад сходамі ў брамах, пад плотам, ва ўборных, сутарэньнях, на пустых плацох кладуцца яны спаць, атулячы свае дробныя, дрыжачыя ад холаду цельцы, лахманамі, якія даюць ілюзію цяпла.

У канцы Бжэзінскай вуліцы знаходзіцца вялікае пустое поле, дзе звальваецца гной з усяго гораду. З надыходам зімы на гэтым полі, у гнаі гнездзіцца некалькі сот дзяцей вуліцы. Як вядома, — зазначае газэта, — гной зьяўляецца добрай аховай ад холаду. Каб правесьці цёпла ноч, дзеці закопваюцца ў гной па шыю.

Іншыя начуюць у сабачых буды. Яны сябруюць з сабакамі, якім прыносяць час ад часу косьці, і сьпяць разам з імі ў будзе на саломе, поўнай ўсякай нечысьці. Сьпяць таксама і на сьметніках, «Арыстакратыя»-ж начуе ў пэўнай пустой малой крыўлянай шопцы, якая знаходзіцца ў канцы Трамвайнай вуліцы. Кожную ноч сюды зьбіраецца каля 30 хлапчукоў, якія, прытуліўшыся моцна адзін да другога, бо так цяплей, праводзяць ноч. Усе дзіркі і шчыліны пазатыканы шкатамі, так што смурод нязносны. Бруд і сьмецьце ляжыць там цэлымі кучамі.

На кожнага, хто хоча ім дапамагчы (!?), гэтыя апушчаныя, зьдзічалыя дзеці ўзіраюцца, як на ворага, з нэнавер'ем. Свой вобраз жыцьця, з якім яны зрасьліся, гэтыя дзеці, як дзікія зьвяры, абараняюць зубамі і пазногцямі. Сябруюць з найгарэйшымі адкідамі грамадзтва дапамагаюць эмэзеям, — вучацца ка прафэсыянальных зладзеяў і бандытаў».

ХВАЛЯ ЗАБАСТОВАК ВА ЎСЁЙ ПОЛЬШЧЫ

ВІЛЬНЯ. У сувязі з наступленьнем прадпрымальцаў на і так жабрацкую зарплату рабочых, у апошнія часы па ўсёй Польшчы пракацілася новая хваля забастовак.

Сацыял-фашысці «Роботнік» паведамляе аб забастоўцы на гуце ў Горадні. Бастуючыя патрабуюць выплаты заработку, аплаты за звышчасовыя гадзіны і прыняцьця на фабрыку зволеных рабочых.

Забастоўка носіць надзвычай бурны характар. Гута акружана ўзмоцненымі атрадамі паліцыі. Паміж паліцэйскімі і бастуючымі адбываюцца бязупынныя сутычкі. Шмат рабочых арыштавана.

Дырэкцыя гуты пры дапамозе пэпэсэўскіх прафбюракратаў стараецца сарваць забастоўку з сарэдзіны. Імі пашыраюцца правакацыйныя чуткі аб арыштце забастовачнага камітэту, аб тым, што частка рабочых прыступіла на працу і інш. Гэтымі правакацыйнымі чуткамі кіраўніцтва гуты стараецца дэзарганізаваць бастуючых, упусьці ў іх рады разлад і тым самым сарваць забастоўку.

Аднак, бастуючыя жорстка расправяляюцца з правакатарамі і штрэйкбрэхэрамі. Рабочыя заяўляюць, што будуць баставаць да таго часу, пакуль кіраўніцтва гуты ня выканае іх патрабаваньняў. Бастуючыя арганізоўваюць мітынгі, дзе ўхвалююць рэзалюцыі змагацца да поўнай перамогі.

* * *

У Стшэмешыцах забастоўка на шкляной гуце пачалася ўжо сорак дзён. Рабочыя кінулі фабрыку і не пакідалі яе ні дзён ні ночы. Дырэкцыя гуты выкінула ўзброеныя атрады паліцыі, якая атысьціла тэрыторыю гуты ад бастуючых.

* * *

З прычыны закрыцьця фабрыкі ў Заверці, рабочыя абвясьцілі забастоўку. Бастуючыя патрабуюць выплаты дапамогі за перыяд з часу закрыцьця фабрыкі. Рабочыя заняті і не пакідаюць фабрыку.

* * *

14 сьнежня ў Варшаве абвясьцілі забастоўку работнікі т-ва сацыяльнага забесьпячэньня «Пяст». Бастуюць 120 чалавек. Прычына забастоўкі — зьніжэньне заработнай платы, звальненьне работнікаў і прыняцьце на іх месца новых са зьменшаным акладам. Бастуючыя патрабуюць заключэньня дагавору на адзін год, згодна якога не пагоршаецца-б працка, рабочыя не звальняліся-б з работы і быў-бы гарантаваны мінімум зарплаты.

* * *

У сувязі са зьніжэньнем заработнай платы па гарбарні ў Вільні, рабочыя абвясьцілі забастоўку. Бастуе каля 300 чалавек. Перагаворы рабочых з кіраўніцтвам фабрыкі не далі пакуль вынікаў. Бастуючыя патрабуюць ранейшых ставак.

10.000 новых беспрацоўных за тыдзень

ВАРШАВА, 17. Паводле афіцыяльных даных, у кастрычніку бягучага году ў Польшчы было 1.526 нядзейных прадпрыемстваў і 3.875 прадпрыемстваў дзейных. За адзін месяц колькасьць бязьдзейных прадпрыемстваў павялічылася на 38. Параўнальна з 1929 годам колькасьць бязьдзейных прадпрыемстваў павялічылася на 1.040. Адначасова расьце і беспрацоўе. Згодна справаздачы біржы працы, за тыдзень з 8 па 15 сьнежня лічба зарэгістраваных беспрацоўных павялічылася больш чым на 10.000 чал.

Масавыя аблавы і арышты

ВАРШАВА, 17. Паліцыяй праведзены па ўсёй Польшчы масавыя аблавы і арышты рабочых па абвінавачаньні ў камуністычнай дзейнасьці. Асабліва шырокія разьмеры прынялі арышты ў Дамброўскім басэйне.

65.000 таварных вагонаў стаяць бяз руху

ВАРШАВА, 16. Чыгуначная статыстыка паказвае, што па 1 кастрычніка гэтага году па польскіх дзяржаўных чыгунках было 64.676 вагонаў, якія сталі бяз руху. Крызіс на чыгунках узмацняецца. Чыгункі з верасьні гэтага году далі даходу на больш 84 млн. злотых. У параўнаньні з верасьнем мінулага году наступленьне даходаў зьменшылася на 20,5 проц.

Нарэшце з верасьнем 1931 году перавоз пасажыраў у верасьні бягучага году зьменшыўся на 14,2 проц., перавозка тавараў — на 22,3 проц. а агульная праца на чыгунках зьнізілася на 23,6 проц.

Сувязь бандытаў з уладаю ў Амэрыцы

ЧЫКАГА, 16. Старшыня камітэту па барацьбе з бандытызмам у Чыгага палкоўнік Рандольф, былы прэзыдэнт мясцовай гандлёвай палаты, выступіў з заявай, у якой указаў, што камітэт прымушан будзе праз некалькі месяцаў спыніць сваю дзейнасьць, бо сродкі яго пастурова вычэрпваюцца, а прыток новых ахвяраваньняў рэзка скарацілся. Сутнасьць справы ў тым, што, калі камітэт, вядомы пад назвай «тайная шасьцёрка», пачаў расьсьледваньне дзейнасьці Аль Капоне і інш. бандытаў, ён выкрыў сувязь гэтых бандытаў з такімі высокімі асобамі і колаямі, што значную частку выкрыць цёў прышлося проста замяць. Як выказаўся галоўны сьледчы камітэту Джэмі, у адным выпадку яны выкрылі матар'ял, агалашэньне якога падобна дынаміту ўзарвала-б увесь Чыкага. Выкрыцьці гэтыя, хаця яны і ня былі апублікаваны, былі прызнаны небясьпечнымі, і тыя баніры, уласьнікі газэт, прадпрымцы і гарадзкія чыноўнікі, якія сьпярша падтрымлівалі «тайную шасьцёрку», паступова адмовіліся ад гэтага падтрыманьня. (ТАСС).

Германская праса аб аднаўленьні адносін паміж СССР і Кітаем

БЭРЛІН, 16. Аднаўленьне савецка-кітайскіх дыпляматычных адносін узмоцнена ка мэнтуецца далей германскаю прэсай. «Дэйч альгемайнэ цэйтунг» вітае зближэньне паміж СССР і Кітаем, як прадвесьніка сур'ёзнага разражэньня крытычнай атмасфэры па Далёкім Усходзе і як акт, які спрыяе ўсагульнаму міру. Газэта «Тэгліше рундшау» гаворыць аб нэрвовасьці Японіі, пя гледзячы на яе падкрэсьлены зьвешні спакой. Паездка відомага японскага прамыслоўца Кабаяма Оісуна па даручэньні японскага ўраду ў Вашынгтон мае мэтай перш за ўсё перашкодзіць «далейшым вынікам», якія выцякаюць з кітайска-савецкага зближэньня, а іменна — прызнаньню СССР Амэрыкай.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Да ўсебеларускай спартакіяды

Па БССР шырока разгарнулася падрыхтоўка да Усебеларускай зімовай спартакіяды.

Усебеларуская зімовая спартакіяда будзе праведзена ў Менску з 25 лютага па 2 сакавіка 1933 г. Падрыхтоўка праводзіцца пад лозунгамі: мабілізацыі мас фізкультурнікаў і фізкультурніц на ўзмацненьне сацыялістычных форм працы на вытворчасьці і дэтэрмінаванае выкананьне плянавых заданьняў чацьвертага заключнага году пяцігодкі; узьнясьцьця на вышэйшую ступень інтэрнацыянальнага выхаваньня фізкультурнікаў, выяўленьне лепшых калектываў, індывідуальных фізкультурнікаў па ўсіх відах спорту, якія ўваходзяць у праграму зімовага сьвята.

У спартакіядзе прымуць удзел усе раёны БССР. Для падбору ўдзельнікаў ва ўсебеларускай спартакіядзе, ва ўсіх раёнах БССР, на прадпрыемствах, калгасах, саўгасах, ВНУ і г. д. праводзяцца мясцовыя спартакіяды; пераможцы будуць прымаць удзел ва ўсебеларускай спартакіядзе.

Для кіраўніцтва зімовай спартакіядай ВСФК стварыў штаб з камісіямі: арганізацыйна-гаспадарчай, агітмасавай, спарттэхнічнай, па падрыхтоўцы і правядзеньні параду, урачэбна-антропальнай і галоўнай судзейскай калегіяй.

Абвешчан усебеларускі конкурс на лепшую фізкультурную інсцэніроўку, сьпевы, скокі і г. д. Ва ўсебеларускай спартакіядзе прымуць удзел больш 1.000 фізкультурных калектываў.

У парадзе да адкрыцьця спартакіяды прымуць удзел звыш 12.000 фізкультурнікаў.

Антыкалядная кампанія ў Менску

Антыкалядная кампанія праводзіцца па Менскаму раёну з 20 сьнежня па 20 студзеня 1933 г. Менгарсаветам саюзу валўнічых бязбожнікаў па ўсіх фабрыках, заводах, арцелях, жактах і рабочых клюбах арганізоўваюцца антырэлігійныя вечары.

У канцы сьнежня антыкаталічная сэкцыя гарсавету СВБ наладжвае ў польскім тэатры агульна-гарадзкі вечар працоўных палякаў.

Да гэтага часу будуць праведзены канфэрэнцыі жанчын усіх жактаў. 24 сьнежня ў польскім клюбе адбудзецца другая менская гарадзкая канфэрэнцыя саюзу валўнічых бязбожнікаў, прысьвечаная антырэлігійнай кампаніі і перавыбарам гарсавету СВБ.

Для дапамогі ў правядзеньні антыкалядняй кампаніі ў сельсаветы Менскага раёну выедуць культбрыгады з прадпрыемстваў і заводаў г. Менску.

Дом тэхнікі для чыгуначнікаў Менскага вузла

Вясной 1933 г. дырэкцыя МБВ чыг. прыступае да пабудовы Дому тэхнікі ў Менску. Дом тэхнікі зьявіцца базай усіх відаў тэхнічнай прапаганды і дапамога шырокім масам чыгуначнікаў аўладаць тэхнікай рэканструкцыі транспарту.

Эскізы праектаў Дому тэхнікі ўжо распрацаваны архітэктарамі МБВ чыг. т. т. Гусавым і Календа. Дом тэхнікі прадугледжана пабудаваць на вакзальным пляцы. На будаўніцтва адпушчана 500 тыс. руб.

„Калгасная праўда"—кандыдат на ўсесаюзную прэмію

Пленум цэнтральнай камісіі па ўсесаюзным фінансавым конкурсе друку, які адбыўся 8 сьнежня пры рэдакцыі «Известий», заслухаўшы інфармацыю старшыні ўсебеларускай конкурснай камісіі т. Шастакова аб ходзе конкурсу друку ў БССР, за пасьпяховую мабілізацыю мас на выкананьне фінпляну чацьвертага кварталу занёс у сьпіс кандыдатаў на ўсебеларускую прэмію, побач з іншымі цэнтральнымі і раённымі газэтамі СССР, Лепельскую газэту «Калгасная праўда».

Падарунак 15 гадавіне ВЧК—ДПУ

У адзнаку 15 гадавіны ВЧК—ДПУ рабочыя дэпо Магілеў выпускаюць 4 паравозы з халоднай драмыўкі і рамантуюць бягучым рамонтам 15 вагонаў.

Дэпо рыхтуецца да правядзеньня суботніка па зборы мэталялому.

Хроніка

* З 5 лютага 1933 г. па БССР будуць праводзіцца раённыя і гарадзкія шахмацна-шашачныя спартакіяды.

* Усяго па БССР здалі поўнасьцю іспыты на значок «Гатоў да працы і абароны» 42.432 чал., або 121,2 проц. кантрольнай лічбы, даная ВСФК СССР.

* 21.000 руб. сабрана Менгарсаветам СВБ на пабудову падводнай лодкі «Валўнічы бязбожнік».

* Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі выпускае ў 1933 г. 450.000 насьценных календароў і 10.000 настольных.

* 15 сьнежня 1932 г. у польскім клюбе адбыўся інтэрнацыянальны вечар з удзелам рабочых-палякаў г. Менску і рабочай дэлегацыі Амэрыкі.

* Брыгада рабочых-пручыкаў ст. Гомель у адказ на фашысцкі тэрор у Польшчы сабрала 680 руб. у карысьць палітзьняволеных. У адказ на выклік брыгады пручыкаў рабочыя суднарамотных майстэрань у Гомелі пастанавілі адпрацаваць дзьве гадзіны ў карысьць палітзьняволеных і выклікалі ў сваю чаргу калектывы портбуду і інш.

Паведамленьні

— ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што ў Бітомлі 25/XII-32 г., у 10 гадз. раніцы будзе праходзіць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б па разгляду апеляцыйных партэтраў Бягомльскага і Плешчаніцкага раёнаў. На 25/XII-32 г. у Бягомлі: Калочэнка А. А., Булавадо Х. А., Пацялоеў П. М., Булавадо М. Т., Курыцын М. В., Касікаў П. Д., Шыло Я. Ам., Мароз Я. С., Пяродня К. Г., Лазар Ю. З., Красковіч А. П., Шыпенка Т. А., Пічкоўскі П. П., Карпінскі І. А., Гаўрылоўіч М. М., Грынкевіч А. П., Шыло Р. В., Добыш П. С., Кабяк Я. М., Хадановіч М. Я., Дабрыцкі Я. Д.—Плешчаніцы. Абавязакова прадстаўленьне на ПТ характарыстыкі аб апошняй працы.

— Менгарком КП(б)Б выклікае т. Стукача П. П., у адд. кадраў (пакой № 30). Просьба да арганізацый, якія ведаюць яго адрас, паведаміць адд. кадраў Менгаркому КП(б)Б.

— 19-га сьнежня, у 7 гадз. вечара у доме Пісьменьнікаў (Савецкая 68) адбудзецца сходасустрэча народнага паэта ЯКУБА КОЛАСА з пісьменьнікамі з прычыны 50-гадовага яго юбілею. Уваход вольны. Запрашаюцца рабочыя-ўдарнікі.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Кіно Інтэрнацыянал АД 19 СЬНЕЖНЯ
МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ВЫТВОРЧАСЬЦІ САЮЗКІНО
ВЕЦЕР У ТВАР
паводле п'есы Н. Львова „ПЛАВЯЦЦА ДНІ"
Рэжысэр А. ЗАРХІ.
Зьвыш праграмы кіно-хронікі в Саюзкіно
Каса адкрыта штодзённа ад 12 гадз. дня.

19 СЬНЕЖНЯ,
у 6 гадз. веч., у клюбе Мэдсанпрацы (Рэвалюц., 2)
адбудзецца
3-ці Пленум ЦП Саюзу мэдсанпрацы
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Вынікі 2-га Пленуму УсеЦСПС (Дакл. старш. ЦСПСВ т. КАВАЛЬЧУКА).
2. Даклады мясцовых арганізацый аб перабудове прафработы на аснове рашэньняў IX-га зьезду прафсаюзаў (Менск—клінічны гарадок; Гомель—Гарадзкая Аднаны Дыспансэр; Віцебск—больніца; Дзяржынск—райком саюзу; Горы—райком саюзу; Пухавічы—райком саюзу.
3. Кантрольныя лічбы Аховы Здароўя на 1933 год (дакл. НКАЗ).
4. Даклад аб выніках сустрэчнага плянаваньня ЦП саюзу МСП (Пл.-выта, адз. ЦПС МСП т. ЗАКСА).
Запрашаюцца ўвесь прафактыў і мэдпрацаўнікі для прыняцьця ўдзелу ў працы пленуму.
Прэзыдыум ЦП Саюзу мэдсанпрацы.

Наркомасьветы 20-га сьнежня 1932 г. у Менску скліканецца
ўсебеларуская нарада-канфэрэнцыя культпалітасьветных працаўнікоў:
раённспэктароў палітасьветы, загадчыкаў раённых культуры, сельскіх домоў культуры і культ. працаўнікоў 5-ці нтс.
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Рэалізацыя пастановы ЦК КП(б)Б, СНК Саюзгіті НКА аб масавай культпалітасьветнай рабоце (дакл. т. Рудзінскі).
2. Мерапрыемства па рэалізацыі пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб агрэсэўтэрпрапагандзе і падрыхтоўка да пасеўнай кампаніі (дакл. НКЗ).
3. Удзел культпалітасьвет. устаноў у мабілізацыі сродкаў (дакл. НКФ).
4. Аб ходзе ўсенавучу і лікбезу (дакл. т. Захарыч).
Нарада адбудзецца ў 12 гадз. дня.
Прапануецца ўсім райКНА забясьпечыць яўку на нараду згодна дадзенай разьвёрстцы.
Наркомасьветы.

КАМІТЭТАМ ХЭМІЗАЦЫІ ДЭРЖГАДАРКІ БССР
сумесна з Інстытутам хэміі Акадэміі Навук і хэмінстытутам гор. Менску
СКЛІКАЕЦЦА
агульна-гарадзкі сход хэмікаў
(навукова-інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі, студэнцтва і рабочыя хэм. прамысловасьці),
на якім будзе зроблен даклад доцэнтам ГІМЕЛЬФАРБАМ
аб шостым мэндзлееўскім зьезьдзе.
Сход адбудзецца 21-XII-г.г., у 8 гадз. вечара, у Універс. Гарадку, хэм. корпус, 2-гі паверх, вялікая аўдыторыя.
Камітэт хэмізацыі Акадэміі Навук хэм. інстытуты.

МЕНСКІ МАЛОЧНА-ПРАМЫСЛОВЫ ТРЭСТ
арганізуе ў г. Менску
3-месячныя КУРСЫ па падрыхтоўцы тэхнікаў-нармоўшчыкаў для работы ў саўгасах Менмалпрамтрэсту.
На курсы прымаюцца асобы ва ўзросьце ад 18 год. яны кажуць асьвету ў аб'ёме 7-годкі. Могуць быць прыняты асобы з асьветай менш 7-годкі, але зьвязаныя з нармаваньнем або рабочыя з значным вытворчым стажам і належнай падрыхтоўкай.
Курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй, інтэрнатам і сталоўкай.
Жадаючыя паступіць на курсы павінны падаць у сэктар кадраў Менмалпрамтрэсту (Савецкая, 70) заяву і наступныя дакументы: даведку аб адукацыі, даведку аб сац. паходжаньні і становішчы, даведку аб стане здароўя, засьведчаную анкету і характарыстыку аб апошняй рабоце.
Заявы з дакументамі прымаюцца
да 25 сьнежня.
Сэктар кадраў Менмалпрамтрэсту.

СЭСІЯ
БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК,
прысьвечаная
ПАДНЯЦЬЮ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ
АДБУДЗЕЦЦА
у 7 гад. веч. у Доме Камасьветы ў г. Менску 20-XII 1932 г. імя К. Маркса (рог вул. Карла Маркса і Энгельса).
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Задача навукі ў барацьбе за падняцьце ўраджайнасьці сельскай гаспадаркі—дакл. Перпы Віце-Прэзыдэнт т. Домбель.
2. а) Праблема хэмізацыі сельскай гаспадаркі БССР—дакл. акад. Кедраў-Зіхман і вуч. спэц. Братасевіч.
б) Роля хэміі ў барацьбе з хваробамі с.-гаспад. культур—дакл. вуч. спэц. Дарэнкін.
3. Прыродна-кліматычныя ўмовы БССР і праблема ўзьняцьця ўраджайнасьці:
а) кліматычныя магчымасьці БССР у справе падняцьця ўраджайнасьці—дакл. праф. Найгарадаў.
б) Натуральны і культурны рэльеф палёў БССР, як фактар узняцьця ўраджайнасьці дакл. акад. Афанасьеў.
в) Мэты асьвоеньня балот БССР і магчымыя вынікі гэтага асваеньня ў другой пяцігодцы—дакл. вуч. спэц. Усесаюзн. балотн. інстытуту Данукін.
4. а) Праблема новых культур у БССР—дакл. вуч. спэц. т. Ганчарыч.
б) Новыя культуры на асушаных балотах БССР—дакл. вуч. спэц. Усесаюзнага балотнага інстытуту Шчэрбіна.
5. Вытворчы план навукова-дасьледчай працы АН БССР на 1933 г.—дакл. Прэзыдэнт АН акад. Горын.
6. Праект статуту АН БССР—дакл. неадменны сакратар акадэміі Паніцевіч.
Прэзыдыум АН БССР.

МЕНСКАЕ ГАРАДЗКОЕ БЮРО „САЮЗДРУКУ"
АДКРЫТА ПАДПІСКА НА 1933 ГОД НА ЎСЕ ГАЗЭТЫ І ЧАСОПІСЫ СССР,
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА да 20 сьнежня г. г.
выключна філіялямі гарбюро „Саюздруку" яго ўпаўнаважанымі, паштовымі агентамі і лістаносцамі,
Своечасова зданая падпіска гарантуе аматарную дастаўку друку.

АДКРЫТА ПАДПІСКА
1) На 2-е юбілейнае выданьне збору твораў
М. ГОРКАГА.
Выданьне будзе складацца з 26 томаў (у 15 кнігах) у пераплётах колеру „беж" з залатым цісьненьнем.
Усё выданьне закончыцца друкаваньнем у 1933 годзе.
У студзені 1933 г. будзе рассылацца падпісчыкам 3—4 том.
Падпісная цана выданьня—97 р. 50 к. Пры падпісцы ўносіцца задатак 6 руб. 50 кап. і пры атрыманьні кожнага тому (кнігі) наклады плацеж на 6 р. 50 к. Задатак залічваецца пры высылцы апошняй кнігі.
2) На 2-е выданьне „МАЛОЙ СОВЕТСКОЙ ЭНЦИКЛОПЕДИИ"
Выданьне перапрацавана і дапоўнена тэкставым і ілюстрацыйным матэрыялам.
Усё выданьне будзе складацца з 10 томаў у каляжоравых пераплётах. 1-шы том выходзіць з друку ў сьнежні г. г.
Падпісная цана выданьня—80 руб. Пры падпісцы ўносіцца задатак 8 р. і пры атрыманьні кожнага тому накладны плацеж на 8 руб. Задатак залічваецца пры высылцы апошняй кнігі.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: У аддзелах падпіскі выдавецтваў у Менску—Савецкая, 41, Віцебску—Ленінская, 11, Гомелі—Савецкая, 19 і на ўсіх кніжных магазынах і кіосках Беларадзяленьня „КОГИЗа" РСФСР.
Таксама ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПРЫЁМ ПАДПІСКІ на:
„Большую Медицинскую Энциклопедию" задатак пры падпісцы 7 р. 50 к.;
на Справачнік па мэханізацыі сельскай гаспадаркі—задатак пры падпісцы 10 р.;
на Тэхнічны справачнік транспартніка—задатак пры падпісцы—10 р.;
на Анотаваныя карткі бібліяграфічнага інстытуту „ОГИЗ РСФСР".
Аддзел падпісных выданьняў Беларадзяленьня „КОГИЗа".

10-ы ДЭРЖЗЬВЯРЫНЕЦ
ПРЫБЫЎ НОВЫ ТРАНСПАРТ
мышэй і птушак.
Зьвярынец адкрыт з 9 гадз. раніцы да 11 гадз. вечара штодзённа.
Па налетыўных заказах прадстаўляецца 50 проц. скідка. Экспарчацца ў кантору зьвярынцу загадзя.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА КАСА—ад 12 г. дня
Гучэй мастацкі фільм СУСТРЭЧНЫ
Пралетары
Мастацкі фільм Чыны і людзі
Дзесьвяць лічэчных сэансаў ТВАРАМ да ТВАРУ

Кіно СПАРТАК
АД 19 сьнежня выдатны фільм Трыпольская трагэдыя
трагэдыя ў 7 частках.
Штодзённа 5 сэансаў. Каса—ад 1 гадз. дня

ВІЦЕБСКІ
Індустрыяльна-пэдагагічны інстытут
ДВЯВЯЧАЕ НАБОР на 6-МЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ па падрыхтоўцы ў інстытут.
На курсы прымаюцца асобы, скончыўшыя 7-8 груп 9-годкі.
Курсанты забясьпечваюцца ў сярэднім стыпэндыяй каля 35 руб., іншагародніх забясьпечваюцца інтэрнатам.
Заняткі на курсах пачнуцца 15-га студзеня 1933 г.
Заявы прымаюцца ў канцылярыі інстытуту г. Віцебск, Пушкінская, 3.
Дырэкцыя.

Арцель зубных тэхнікаў
Камунальная, 2-1,
прыступіла да вырабу
КАРОНАК
з белага мэталю,
які замяняе золата,
Таксама прымаюцца заказы на залатыя і каўчуковыя пратэзы.

Мсьціслаўскі ВЫЧОТНА-ФІНАНСАВЫ ТЭХНІКУМ
Наркамазему БССР
ДВЯВЯЧАЕ
ДАДАТКОВЫ НАБОР СТУДЭНТАЎ
на 1-шы курс тэхнікуму і чэрговы прыём у цэнтр. малагасьмоўу работы, вучэбу.
Курс навучаньня ў тэхнікуме—3-гадовы. Прымаюцца ва ўзросьце ад 17 да 30 год. Усе паступаючыя без выключэньня падлягаюць іспытам у об'ёме 7-годкі. Прадстаўляць дакументы, згодна даведніка НКА і выключна ў арыгіналах.
Тэрмін навучаньня ў ЦКШ раб. вуч.—6 мес. Узрост на ступаючых ад 17 да 30 год. Адукацыя ня ніжэй 4-годкі. Пры зачыце ў школу павінны быць наступныя дакументы: аб адукацыі, аб узросьце, сац. становішчы, стане здароўя, анкета, засьведчаная с.-с., камсамольцкая калгасу або парт., КСМ, замельн. ці інш. адзяводзін. райарганізацый.
Зьлічэньне ў тэхнікум і ў школу забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй, згодна норм НКЗему ў залежнасьці ад посьпяховасьці.
Прыём заяў у тэхнікум да 1-га студзеня і ў школу да 15 студзеня 1933 г. Да заяў або пісьмов. запытаньню абавязкова дапускаць на 45 кап. паштов. марак. Заявы з дакументамі накіроўваць па адрасе: г. Мсьціслаў, Савецкая вул. 11-9, дырэкцыі МЗФТ або ЦКШ Раб. Вуч.
Без атрыманьня спэц. выпіскі ад дырэкцыі—на вучобу не выяжджаць.
Дырэкцыя.

Менск, друкарня «Зьвязда». Галоўлітбел № 336.